№ 48 (1591)
штотыднёвая грамадска-асветніцкая газета

КУЛЬТУРА

26 лістапада 2022 г.

РАЗМОВА З НАГОДЫ
Куды падзелася скульптура манаха?
Новы колер касцёла і тое, што ўразіць турыстаў
стар. 6–7

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!
Бібліятэка + аўталаўка = ?
Якім павінен быць бібліобус
стар. 13

ІНІЦЫЯТЫВА
Па-за рамкамі класічнага музея.
Экспазіцыя ў тры дзясяткі кіламетраў
стар. 14

ГІСТАРЫЁГРАФ
Сіняя Барада, беларускі Фаўст і "Фатальны пацалунак".
Гістарычная вандроўка па знаёмай вуліцы
стар. 15

ФАКТЫ З БІЯГРАФІІ КРАІНЫ

V Нацыянальны форум "Музеі Беларусі" рыхтуецца да адкрыцця

3—4 снежня ў пяты раз у Рэспубліцы Беларусь пройдзе Нацыянальны форум "Музеі Беларусі". Прадстаўнікі музейнай супольнасці краіны, а таксама замежныя госці збяруцца, каб абмеркаваць актуальныя пытанні музейнай дзейнасці, вызначыць тэндэнцыі яе развіцця і прадэманстраваць дасягненні.
Тэма сёлетняга форуму — "Музеі. Спадчына. Памяць".

Працяг тэмы на стар. 2

Газета "Культура"

Індывідуальны
63875
Адзін месяц — 14,21 руб.

Ведамасны
638752
Адзін месяц — 23,49 руб.

Ільготны
(для юрыдычных асоб, афармленне падпіскі ў адрас сваіх супрацоўнікаў і пенсіянераў)
63879
Адзін месяц — 15,83 руб.

Ільготны індывідуальны на паўгоддзе
63872
Шэсць месяцаў — 74,03 руб.

-15%

Ільготны ведамасны на паўгоддзе
638722
Шэсць месяцаў — 121,52 руб.

Камплект: газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"

Індывідуальны
63874
Адзін месяц — 29,87 руб.

Ведамасны
638742
Адзін месяц — 54,89 руб.

-10%

Часопіс "Мастацтва"

Індывідуальны
74958
Адзін месяц — 19,21 руб.

Ведамасны
749582
Адзін месяц — 37,77 руб.

Ільготны
(для юрыдычных асоб, афармленне падпіскі ў адрас сваіх супрацоўнікаў і пенсіянераў праз аддзяленні РУП "Белпошта")
74986
Адзін месяц — 21,43 руб.

Ільготны індывідуальны на паўгоддзе
74941
Шэсць месяцаў — 98,17 руб.

-15%

Ільготны ведамасны на паўгоддзе
749412
Шэсць месяцаў — 192,36 руб.

"Культура — вось што робіць беларуса беларусам, а не проста «тутэйшым»... Не толькі наша вельмі багатая спадчына: літаратура, музыка, архітэктура, але і мова, якую мы павінны ведаць, гісторыя, якую мы павінны памятаць, і каштоўнасці, якія мы павінны паважаць".

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА

На тыдні

Палац Рэспублікі адзначыў 25-годдзе. Міністр культуры **Анатолій Маркевіч** павіншаваў калектыў з юбілеем, падкрэсліўшы прафесіяналізм, творчасць і адказнасць работнікаў палаца.

— Мы ганарымся нашымі сумеснымі праектамі, якія накіраваны на духоўнае ўзбагачэнне ўсіх слаёў нашага насельніцтва, на атрыманне зараду станоўчых эмоцый і настрою. Асобай вяхой у развіцці Палаца Рэспублікі стала стварэнне прафесійнага калектыву — Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь, які сёлета святкуе 20-годдзе, — сказаў у прывітальным слове міністр.

Супрацоўнікі ўстановы былі адзначаны падзякамі і ўзнагародамі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада, Савета Рэспублікі, Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама Міністэрства культуры і іншых ведамстваў.

▪▪▪

У рамках Адзінага дня інфармавання рабочая група Міністэрства культуры выехала ў раёны Мінскай вобласці. Мэта — вывучэнне эфектыўнасці работы ўстаноў культуры.

Міністр культуры Анатолій Маркевіч падчас візіту ў г. Вілейку прыняў удзел у пасяджэнні Вілейскага раённага выканаўчага камітэта.

Адзіны дзень інфармавання, прамыя тэлефонныя лініі і прыёмы грамадзян прайшлі яшчэ ў 14 гарадах Мінскай вобласці.

▪▪▪

Адбылася сустрэча першага намесніка міністра культуры **Валерыя Грамады** з міністрам культуры Удмурцкай Рэспублікі РФ **Уладзімірам Салаўёвым**. Мэта — пашырэнне культурнага супрацоўніцтва з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі, развіццё музейных праектаў і абменных гастроляў.

Акрамя таго, быў падрыхтаваны праект мемарандума з Удмурцкай філармоніяй і намечаны планы па канцэртных праектах нацыянальных і акадэмічных калектываў.

▪▪▪

Выязныя пасяджэнні рэспубліканскага савета пры Міністэрстве культуры прайшлі ва ўстановах культуры Любанскага раёна Мінскай вобласці. Былі ўзняты пытанні клубнай дзейнасці, народнай творчасці, ходу рэалізацыі культурных праектаў і распрацоўкі механізма стымулявання народных майстроў.

▪▪▪

Вынікі працы ўстаноў культуры Магілёўскай вобласці абмеркавалі ў Міністэрстве культуры. Быў праведзены дэталёвы аналіз, агучаны хвалюючыя пытанні, а таксама абазначаны праблемы і шляхі іх вырашэння па выніках выезду супрацоўнікаў міністэрства.

Музеі. Спадчына. Памяць

V Нацыянальны форум "Музеі Беларусі" пройдзе 3—4 снежня ў Мінску. Прадстаўнікі больш чым 80 дзяржаўных музеяў і галерэй, айчынныя і міжнародныя эксперты плануюць абмеркаваць тэму "Музей. Спадчына. Памяць", абмяняцца навацыямі і досведам.

Упершыню мерапрыемства адбылося ў 2012 годзе ў Гродне. У 2014-м музейшчыкі збіраліся ў Гомелі, праз два гады іх чакаў Магілёў, у 2019-м — Брэст. Сёлетні форум сустракае сталіца. Як відаць, ён стане важнай падзеяй у культурным жыцці не толькі нашай краіны: падчас урачыстага адкрыцця плануецца падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж музеямі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

У дзелавой праграме, якая разгорнецца ў спартыўна-культурным цэнтры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, прадугледжаная работа чатырох секцый: "Патрыятычнае выхаванне праз музейную дзейнасць", "Музей — тэрыторыя гістарычнай памяці", "Музей і спадчына", "Культура і побыт беларусаў". Пройдзе і круглы стол па развіцці культурна-пазнавальнага турызму.

Таксама ў межах форуму правядуць конкурс прафесійнага майстэрства па намінацыях: "За навацыі ў музейнай дзейнасці", "За найлепшы музейны праект", "За найлепшае прадстаўленне музея ў экспазіцыі форуму", "За найлепшую культурна-адукацыйную праграму", "За найлепшае музейнае выданне".

— Форум з'яўляецца адной з галоўных пляцовак для прэзентацыі музеяў як найважнейшага адукацыйнага і выхаваўчага рэсурсу грамадства, сродку ўзбагачэння духоўнага патэнцыялу нацыі, — адзначае Надзея Аўдзей, кансультант упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. — У мэтах мерапрыемства — прыцягненне ўвагі наведвальнікаў, прадстаўнікоў дзелавых колаў і сродкаў масавай інфармацыі да музейнай справы. Гэта ўнікальная платформа для абмену вопытам і развіцця музейнай справы. Да сустрэчы на V Нацыянальным форуме "Музеі Беларусі"!

"Дыямент ведаў" — на ВДНГ

Да святкавання стагоддзя галоўнай кніжнай скарбніцы нашай краіны далучыліся ў Маскве. Расійскім гледачам прадставілі фотапраект "Нацыянальная бібліятэка Беларусі: учора, сёння, заўтра".

Стагадовы юбілей — нагода для асэнсавання пройдзенага шляху, падвядзення вынікаў і вызначэння перспектыў. Таму мэтай праекта стаў аповед пра багаты вопыт і пошукі новага, спалучэнне традыцый і навукова-тэхнічных дасягненняў. На выставе дэманструюцца архіўныя і сучасныя мастацкія фотавобразы, сабраныя адмыслова да юбілею. Індывідуальны стыль кожнага мастака дазваляе ўбачыць мінулае, сучаснасць і будучыню бібліятэкі праз прызму творчага ўяўлення аўтараў.

— Нам хацелася зрабіць гэты праект асаблівым, каб ён аб'ядноўваў эпохі. Спачатку мы меркавалі, што гэта будзе серыя фотаздымкаў, прысвечаных пэўным этапам дзейнасці бібліятэкі, аднак нашы партнёры — людзі творчыя — перакроілі канцэпцыю. І ў выніку працы перадаюць яркае ўяўленне пра ўстанову, — адзначыла генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аксана Кніжнікава.

Першымі экспазіцыю ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі ўбачылі дыпламаты, прадстаўнікі бібліятэчнай супольнасці, творчая інтэлігенцыя і беларуская дыяспара. Далей праект будзе дэманстравацца шырокай аўдыторыі ў павільёне нашай краіны на Выставе дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве.

Будні і святы

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 22 лістапада. Дзякуючы сродкам відэасувязі, у сходзе таксама паўдзельнічалі начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

28 лістапада пройдзе выязное пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры па тэмах выканання Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы, капітальнага рамонту на аб'ектах культуры, якія фінансуюцца за кошт рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, а таксама ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы. Удзельнікі калегіі азнаёмяцца з ходам рэстаўрацыі ў Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку, рэканструкцыі будынка культурна-дзелавога цэнтра ў парку імя Фрунзэ ў Віцебску, наведаюць Ваенна-гістарычны музей Героя Савецкага Саюза Канстанціна Заслонава ў Оршы і Палац культуры ў Барані Аршанскага раёна.

Кіраўніком дзяржавы зацверджана праграма агульнарэспубліканскіх навагодніх мерапрыемстваў. 26 снежня ў Палацы Рэспублікі правядуць дабрачыннае навагоднае свята ў рамках акцыі "Нашы дзеці". У аснове падзеі — прадстаўленне "Сузор'е зубра", якое распавядзе маленькім гледачам пра гісторыю і сучаснасць Беларусі. Пазней наведаць імпрэзу змогуць усе ахвотнікі да 5 студзеня.

На 27 снежня для вучняў старэйшых класаў і студэнтаў запланаваны навагодні баль у беларускіх традыцыях розных гістарычных эпох XVI—XIX стагоддзяў, кожнай з якіх будзе адпавядаць адзін з дзесяці адмыслова падрыхтаваных танцаў: паланэз, полька, кадрыля, галоп і іншыя. Таксама перад удзельнікамі мерапрыемства выступяць оперныя салісты і інструментальныя калектывы, а адвольная праграма ўключыць майстар-класы па сучасных бальных танцах еўрапейскай і лацінаамерыканскай традыцый. З 4 да 6 студзеня ў Палацы Незалежнасці для прыёмных дзяцей і выхаванцаў шматдзетных сем'яў з рэгіёнаў зладзяць інтэрактыўныя прадстаўленні, заснаваныя на казцы "Таямніца часу".

На 10 студзеня запланаванае ўрачэнне прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне", спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва, спецыяльных прэмій "Беларускі спартыўны Алімп". Пасля ўрачыстай цырымоніі адбудзецца канцэрт "Мастацтва як сэнс жыцця", а ў фае правядуць выставу дасягненняў лаўрэатаў прэмій. 13 студзеня мусіць прайсці афіцыйны прыём ад імя Кіраўніка дзяржавы на стары Новы год. Падчас падзеі прадугледжаны ўзнагароджанне найбольш паспяховых прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці, а таксама танцавальна-забаўляльная праграма.

Сучасны танец на вялікай сцэне

Пасля двухгадовага перапынку Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі IFMC вярнуўся ў родны Віцебск. Нягледзячы на працяглы антракт, выклікаць пандэміяй і закрыццём межаў, сёлета на ўдзел у конкурсе паступіла 75 заявак з чатырох краін. Адборачны відэатур прайшлі 25 калектываў.

ЭСТРАДА З ПЁРАМІ — НЕ НАШ ФАРМАТ

Міжнародны фестываль праходзіць з 23 па 27 лістапада ў паўночнай культурнай сталіцы Беларусі. Асноўнымі пляцоўкамі форуму сталі канцэртная зала "Віцебск" і Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа. На працягу пяці дзён гледачы і суддзі паглыбляюцца ў свет сучаснай харэаграфіі пры дапамозе рознафарматных пастановак.

У спісе доўгачаканых гасцей — "Балет Яўгена Панфілава". Прыхільнікі пермскага тэатра ўбачылі нядаўнія работы калектыву, адноўленыя мініяцюры і яшчэ адзін з балетаў маэстра. Іх паказалі ў вечар памяці Яўгена Панфілава, які пайшоў з жыцця 20 гадоў таму.

У гасцявой афішы таксама заяўленыя знаёмыя віцебскай публіцы калектывы — "Правінцыйныя танцы" з Екацярынбурга, "Канон Данс" з Санкт-Пецярбурга.

Аб праграме форуму расказала яго дырэктар, намеснік генеральнага дырэктара па спецыяльных праектах Цэнтра культуры "Віцебск" **Марына Раманоўская**:

— На жаль, два гады запар мы адмянялі фестываль, але напрацаваны каласальны вопыт дапамог зноў стаць на прывычныя рэйкі, каб прадоўжыць пісаць сваю гісторыю. Праграма мерапрыемства ўключае майстар-класы, сустрэчы, відэалекцыі і фотавыставы. Нягледзячы на няпросты час, геаграфія ўдзельнікаў уражвае: Чалябінск, Томск, Омск, Новасібірск, Масква, Казань, Гомель, Мінск, Віцебск. Калі 10 гадоў таму адбор праходзіў па крытэрыі "да нас — не да нас" (напрыклад, эстрада з пёрамі і бальныя танцы — сапраўды не наш фармат), то зараз усе канкурсанты разумеюць, куды яны падаюць заяўкі. Цяпер мы кіруемся крытэрыем навізны і імкнёмся ацаніць, наколькі выступленне будзе цікавае гледачу.

Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі ў Віцебску International Festival Modern Choreography праводзіцца штогод з 1987-га ў другой палове лістапада. IFMC стаў першым і да 1997 года з'яўляўся адзіным форумам сучаснага танца на тэрыторыі былога СССР. Праграма IFMC уключае балетныя спектаклі, выступленні тэатраў танца, выставы фота і жывапісу, прысвечаныя харэаграфіі, практычныя майстар-класы, лекцыі пра сучаснае мастацтва, прэзентацыі, прэс-канферэнцыі, адкрытыя дыскусіі, кінапаказы.

РАЗМОВА ПРАЗ ТАНЕЦ

Цяперашні 33-і фестываль адразу заявіў пра сябе як цікавы творчы праект. Форум дазваляе перадаць сённяшнія адчуванні праз харэаграфію і з'яўляецца той самай пляцоўкай, на якой адбываюцца асноўныя падзеі не толькі нацыянальнага, але і сусветнага сучаснага танца. Асаблівасць сёлетняй праграмы — на сцэне будуць паказаны спектаклі міждысцыплінарнага характару. Гэта танцтэатры, драматычныя і харэаграфічныя пастаноўкі, якія вырашаны выключна элементамі пластыкі.

Святлана Гуткоўская, загадчык кафедры харэаграфіі, прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, знаёмая з фестывалем з 1993 года, апісвае яго наступным чынам:

— IFMC — выдатная адукацыйная платформа. Акрамя як на майстар-класах вядомых спецыялістаў, студэнты кафедры харэаграфіі могуць пераняць практычны досвед, удзельнічаючы непасрэдна ў конкурсе. Таксама ёсць варыянт выкарыстаць платную акрэдытацыю, каб за пяць дзён убачыць прафесійныя трупы, якія працуюць не толькі на тэрыторыі Беларусі і Расіі, але і за мяжой. Лепшай вучобы немагчыма ўявіць. Гэты фестываль адзін з нямногіх, што з'яўляюцца двухтурнымі. Менавіта лаўрэаты такіх конкурсаў могуць разлічваць на дапамогу фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Як сябра экспертнай рады хачу сказаць, што разам з журы мы таксама адсочваем тэндэнцыі, якія фестываль задае ў сучасным танцы. Бывае, наша меркаванне разыходзіцца з поглядам журы. Харэаграфія перш за ўсё ўспрымаецца эмацыйна, а не рацыянальна. У многім дзякуючы IFMC, у 2014 годзе на кафедры БДУКМ мы адкрылі такі напрамак, як сучасны танец.

ХТО ПЕРАМОЖА?

Сучасны танец зразумелы не кожнаму гледачу, бо гэты від харэаграфіі патрабуе папярэдняй працы, пэўных ведаў. Але ж тыя, хто разбіраецца ў мастацтве, у каго ёсць сваё бачанне, змогуць па-сапраўднаму ацаніць нумары канкурсантаў. Акрамя мастацкага складніка, улічваецца тэхнічная падрыхтоўка і навізна.

Першы тур міжнароднага творчага спаборніцтва закрыты: дапускаюцца толькі экспертная рада, журы, удзельнікі і прэса. Потым суддзі вызначаюць фіналістаў, з чыіх выступленняў і фарміруецца публічны паказ. Дарэчы, сёння ў канцэртнай зале "Віцебск" гледачы змогуць атрымаць асалоду ад незвычайных харэаграфічных рашэнняў падчас фіналу конкурсу.

Настасся ЮРКЕВІЧ

Памочнік у тваёй справе!

Вольга Галубовіч, спецыяліст па сувязях з грамадскасцю Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж":

— За час работы ў музеі-запаведніку прызвычаілася пачынаць працоўны тыдзень знаёмствам са свежым нумарам газеты "Культура". Шчыра кажучы, адразу абавязкова гляджу апошнюю старонку з "Афішай": цікава, чым жывуць калегі, якія праграмы прапануюць. Сярод любімых рубрык — "Стужка жыцця", дзе вельмі падабаецца форма падачы матэрыялу пра тых ці іншых выбітных асоб. Без "нагрувашчвання" інфармацыі, толькі цікавыя і важныя факты з біяграфіі, праілюстраваныя фотаздымкамі, малюнкамі.

Увогуле, выданне ўздымае самыя вострыя пытанні, якія датычацца мастацтва і рэчаіснасці ў цэлым, эмацыйна рэагуе на праблемы, што хвалююць грамадства, расказвае пра культурнае жыццё не толькі сталіцы ці буйных гарадоў, але і беларускай глыбінкі. У кожным нумары можна знайсці інфармацыю пра самыя цікавыя культурныя падзеі, актуальныя рэпартажы, публіцыстыку.

Радуе, што газета не толькі захоўвае памяць пра выдатных дзеячаў культуры і мастацтва, але і адкрывае таленты, падтрымлівае новае пакаленне — гэта адлюстравана ў "Максіме маладых".

Што яшчэ хацелася б бачыць на старонках выдання? Магчыма, больш пляцовак для змястоўных, абгрунтаваных дыскусій. Таксама хачу, каб "Культура" ініцыявала асветніцкія праекты і надалей.

Настасся Карэцкая, студэнтка 4 курса Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў:

— Не скажу, што я пастаянны чытач "Культуры", але дакладна рэгулярны наведвальнік сайта газеты, асабліва новага — kultura-info.by. Мая любімая рубрыка — "Максіма маладых". Падабаецца дазнавацца пра таленавітых, мэтанакіраваных хлопцаў і дзяўчат, на якіх хочацца раўняцца, у якіх можна нешта пераняць. Сама ва ўсім імкнуся да дасканаласці. Прываблiваюць апытанкі: матэрыял пададзены выразна і сцісла. Лічу, што кожны чалавек са свету мастацтва павінен хоць неяк сутыкацца з "Культурай", няхай нават у інтэрнэце. Гэта правіла добрага тону — быць у курсе навін сферы, дзе ты працуеш.

Таму так трымаць, "Культура"! Не бойцеся рызыкаваць і ўносіць нешта новае. Паверце: нам, маладым, заўсёды падабаюцца свежы погляд і крэатыў.

Заставайцеся з намі!

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 48 / 26 ЛІСТАПАДА 2022 г.

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 48 / 26 ЛІСТАПАДА 2022 г.

Бабруйскі пляц драматургіі

16 лістапада ў Бабруйску завяршыўся VIII Рэспубліканскі фестываль нацыянальнай драматургіі. Найлепшым быў прызнаны спектакль “Не пакідай мяне...” Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы. Пэўна, назва аказалася сімвалічна прарочай, бо роздумы пра фестываль не пакідаюць нікога, хто да яго спрычыніўся.

ГОСЦІ І ГАСЦІНЦЫ

Гасціннасць бабруйчанаў ні ў якой меры не адпавядае шматлікім анекдотам пра яўрэйскую беражлівасць на мяжы абсурду. На гэтым фестывалі — усё акурат наадварот! Найлепшы гатэль, куды засяляюць усіх удзельнікаў (і нават студэнтаў). Зала пасяджэнняў, дзе журы, крытыкі, ганаровыя госці заўсёды могуць глынуць кавы ў перапынку між праглядамі і пакаштаваць не толькі зефір з мармеладам мясцовай вытворчасці, але і фірменныя хатнія стравы супрацоўнікаў тэатра. Запрашэнне на фестываль вялікай колькасці гасцей — у тым ліку кіраўніцтва тэатраў, незалежна ад непасрэднага ўдзелу калектываў у праграме (у мінулыя гады, прынамсі, драматургаў сярод гасцей бывала і паболей). Добра сфарміраваны расклад фестывальных мерапрыемстваў. Іншыя арганізацыйныя “дробязі”, уключаючы транспартныя паслугі. Дарэчы, калі тэатральны аўтобус выправіўся на выязны спектакль у Магілёве, з гатэля да тэатра і назад усіх падвозілі зноў-такі самі супрацоўнікі. І тым самым не на словах, а на справе дэманстравалі справядлівасць формулы: “Тэатр — гэта родны дом”.

У бабруйскім тэатры, што носіць імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, увогуле ўмеюць сустракаць гасцей — тую ж публіку. І не толькі ў час фестывалю! Завітаўшы сюды напярэдадні на прэм’еру фантасмагорыі “Анёлы не плачуць”, я была здзіўленая не толькі адметнымі па дызайне праграмкамі, але і спецыяльна ўсталяванай фотазонай, адпаведнай новаму спектаклю: стыльны чорна-белы заднік з двума крыламі. Не дзіва, што ўзнікалі чэргі з жадаючых зрабіць сэлфі. Дадатковыя выдаткі? Але і прыбытак. Бо такія здымкі, выкладзеныя ў сацсетках, працуюць на манер сарафаннага радыё.

Дый на самім фестывалі хапала ўнутрытэатральных славутасцей. У фае, як заўжды, быў змешчаны “куточак” Дуніна-Марцінкевіча: пісьмовы стол, крэсла, канапка, стэнды з інфармацыяй пра гэтага пісьменніка і драматурга. Была і музычная ўверцюра, забяспечаная выкладчыкамі мясцовай школы мастацтваў. У рамках фэсту адбываліся творчыя сустрэчы для дзяцей і падлеткаў: знакаміты драматург Аляксей Дудараў наведаў гімназію № 3, з сацыяльным праектам “Запаветнае жаданне” тэатр рушыў у школу-інтэрнат для дзяцей з парушэннем слыху і ў Дзіцячы дом Бабруйска, студэнты Акадэміі мастацтваў паўтарылі адзін са сваіх паказаў фрагментаў “Шляхціца Завальні” Яна Баршчэўскага для вучняў 34-й школы. І паўсюль — самая шчырая гасціннасць і гарачыя эмоцыі. У тым ліку непасрэдна ў глядзельных залах, дзе практычна ўсе фестывальныя спектаклі былі аншлагавымі. Дарэчы, яшчэ адным прыкладам гасціннасці стаў прыз глядацкіх сімпатый, аддадзены бабруйчанамі магілёўскаму спектаклю “Прымакі” — прытым што гэтая п’еса Янкі Купалы паспяхова ідзе і ў іх тэатры таксама.

КЛАСЫ І МАЙСТРЫ

Як усялякі добры фестываль, цяперашні бабруйскі прадугледжваў не толькі спектаклі і творчыя сустрэчы, але і асветніцкую лінію — прычым і для шырокай публікі, якая адкрывае для сябе новыя імёны і пастаноўкі, і ўласна для тэатральных дзеячаў. Самымі, бадай, пільнымі і зацікаўленымі слухачамі лекцыі Кірыла Куранногa з Латвіі пра дзейнасць прадзюсара і арганізацыю гастроляў былі дырэктары нашых тэатраў. Шмат надзей было і на лекцыю-майстар-клас “Відэа ў тэатральных пастаноўках”, ды тыя спадзяванні не спраўдзіліся. Бо ў такога роду мерапрыемствах вельмі важная не толькі абраная тэма, але і асоба дакладчыка. А тут за прыгожай шыльдачкай хаваўся сціслы, літаральна на некалькі хвілін, пералік асобных прыкладаў выкарыстання відэа ў тэатры і працяглая чытка п’есы, даволі недарэчна аформленая з дапамогай слайдаў.

Дарэчы, у праграме фестывалю былі прадугледжаны, як заўжды, некалькі чытак, падрыхтаваных і студэнтамі БДАМ на чале з мастацкім кіраўніком курса Віталём Катавіцкім, і мясцовымі акцёрамі пад кіраўніцтвам рэжысёра Дзмітрыя Нуянзіна. Усе яны (і асабліва студэнцкія работы) былі бліжэйшыя да іншага жанру — тэатральнага эскіза. Бо ўтрымлівалі не столькі асэнсаванне тэксту, колькі яго візуалізацыю. І сталі своеасаблівай гульнёй у тэатр, дзе шмат сцэнічнага руху, ёсць зварот да прыёму “тэатра ў тэатры” (ажно да чытання-разыгрывання аднаго з апавяданняў Яна Баршчэўскага ў... бамбасховішчы пад выццё сірэн і грукат бамбёжкі), ды часам нестае пранікнення ў падтэкст. Дарэчы, студэнты былі трэцякурснікамі спецыяльнасці “Рэжысура драматычнага тэатра” і паказвалі ўласныя работы: Арыны Арловай, Дар’і Усцінавай, Яўгена Сотнікава. Пэўна, справа менавіта ў калектыўнай працы пад кіраўніцтвам педагога, у імкненні зрабіць з гэтых эскізаў адно цэласнае палотнішча, але рэжысёрскія індывідуальнасці не прасочваліся. Пры ўсёй адрэпетаванасці і нават вымуштраванасці зладжаных дзеянняў усіх удзельнікаў паказу ва ўсіх трох фрагментах і ўступе, што ўтрымліваў аповед пра аўтара, быў адзін недахоп, выяўлены ў большай ці меншай ступені: няўменне даносіць тэкст не праз яго візуалізацыю (з гэтым якраз усё было выдатна), а праз асэнсаванне. Вядомы рэжысёр, мастацкі кіраўнік Мінскага абласнога драмтэатра Валерый Анісенка, які паглядзеў увесь фестываль цалкам, меў рацыю, калі неаднаразова гаварыў пра неабходнасць на нашых тэатральных фестывалях майстар-класаў ад вядучых расійскіх спецыялістаў — найперш па сцэнічным маўленні.

“ВЕЧНАЗЯЛЁНАЯ” КЛАСІКА

Сёлетні фестываль быў скіраваны на класіку. А дакладней, на правераныя часам сюжэты, тэксты, метады і пастановачныя прыёмы ўвасаблення драматургіі. Што ж, класіка папраўдзе “вечназялёная”, яна не скідвае па восені лісце. Але гэта не значыць, што яна павінна быць расфарбаваная па прынцыпе “адным колерам”.

На цяперашнім фестывалі не было менавіта драматургічных пошукаў (а за імі, зразумела, і новых рэжысёрскіх падыходаў), чым гэты форум адрозніваўся ў мінулыя разы, калі на ім узнікала куды больш творчых спрэчак, гарачых дыскусій. Невыпадкова нават адзінкавыя прыклады п’ес, звернутых да сучаснасці, былі максімальна “прыгладжаныя”, каб з іх не тырчэлі вострыя вуглы сацыяльнай праблематыкі. “Метро” Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа з Віцебска пазбавілася многіх красамоўных дэталяў п’есы Аляксандра Савухі, названай аўтарам камедыяй, з-за чаго стала па жанры “гісторыяй” — іншымі словамі, засяроджаным расповедам. Нават у “Нобелеўскім тыдні” сталічнага Новага драматычнага тэатра, дзе тэкст Валянціна Пепяляева быццам вытканы з хвосткай публіцыстыкі (і герой п’есы — журналіст, і гавораць персанажы пазычанымі са СМІ лозунгамі ды клішэ), ігра акцёраў стала больш мяккай, “лагоднай”.

На такім добра “прычасаным” фоне вылучалася лірычная драма “Песя і Янка” гаспадароў фестывалю — Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча. Пры ўсёй традыцыйнасці спектакля тэатр не стаў пазбаўляцца неадназначных сітуацый, апісаных у п’есе Аркадзя Шульмана і Яна Карпінскага, прызнанай на фестывалі найлепшай. Заснаваная на дакументальнай гісторыі гераіні, якая перажыла цяжкія ваенныя і пасляваенныя гады, п’еса прасякнутая сапраўдным болем усіх тых, хто апынуўся ў акупацыі і сутыкнуўся з Халакостам.

У праграму былі ўключаныя адразу два спектаклі паводле “Альпійскай балады” Васіля Быкава. Гэта адразу заклала зерне своеасаблівага творчага спаборніцтва між тэатрамі і крытычнага абмеркавання, параўнання сярод гледачоў. Тым больш што падыход да нацыянальнай класікі тут прынцыпова розны. “Альпійская балада” РТБД у пастаноўцы Святланы Навуменка — папраўдзе быкаўская, экспрэсіяністкая. “Альпы. Сорак першы” ТЮГа — наадварот, гэткае песенна-канцэртнае ўвасабленне вечнасці кахання. І тое, што за найлепшую рэжысуру быў вылучаны музычны спектакль Таццяны Самбук, вельмі далёкі ад быкаўскай прозы, толькі пацвердзіла ўзяты фестывалем курс на згладжванне “востравугольнасці”.

ПРА МАЛОЕ І ВЯЛІКАЕ

Праграма фестывалю ўтрымлівала ўсяго адзін спектакль на малой сцэне — іранічную драму “Блытаніна” Гомельскага гарадскога моладзевага тэатра па п’есе Аляксея Макейчыка. Гэты твор у пастаноўцы Дзяніса Фёдарава атрымаў выключна станоўчыя водгукі крытыкаў, але застаўся без узнагарод, аддадзеных куды больш маштабным праектам на вялікай сцэне. Між тым камернасць — зусім не сінонім недастачы ідэй, бо думак у “Блытаніне” было выказана шмат. Яшчэ больш іх, я ўпэўненая, засталося ў галовах гледачоў. Дый увогуле, усялякі рух наперад патрабуе спачатку эксперымента на чымсьці маленькім, каб перанесці паспяховыя вынікі на штосьці больш вялікае.

Не было на фестывалі і спектакляў тэатраў лялек, а менавіта ў такой эстэтыцы бывае зручней увасобіць драматургічныя фантазіі. Невыпадкова яе ўздзеянне адчуваецца сёння ў любых відах тэатральнай творчасці, уключаючы опернае мастацтва. Канешне, ахапіць усё немагчыма, але фестываль — гэта пляцоўка разнастайнасці, нават калі абіраецца нейкі адзін жанр ці пункт гледжання. Бо прызначэнне любога форуму — убачыць у малым вялікае, падтрымаць найлепшыя парасткі новых мастацкіх з’яў. Асабліва ў нацыянальнай драматургіі і яе ўвасабленні. Таму шматлікія пажаданні фестывалю зводзіліся да галоўнага: каб ён развіваўся, пашыраўся, рос. Абавязкова!

Надзея БУНЦЭВІЧ

Юрый Крупянкоў прэзентуе літаграфію "Ахвяры"

Адбіткі нашага болю

Мастацкі камбінат Беларускага саюза мастакоў зладзіў сімпозіум па літаграфіі “Сляза, што ўпала на попел”, прысвечаны трагедыі беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Тэму падзеі прадыктаваў не толькі Год гістарычнай памяці: ідэя ўзнікла падчас праектавання экспазіцыі музея, які будуецца ў Хатыні. На думку дырэктара мемарыяльнага комплексу **Артура Зельскага**, у савецкія гады нарадзілася каласальная колькасць работ пра вайну, але даволі малы пласт падобных твораў прысвечаны трагедыі мірных людзей. “Ніводзін народ не перажыў тых няшчасцяў, якія перажыў наш. І мы павінны паказваць гэта, крычаць пра гэта на ўвесь свет”, — адзначыў Артур Гар’евіч.

Такім чынам перад удзельнікамі паўстала задача запоўніць тэматычную лакуну. Яшчэ сімпозіум мусіў прадэманстраваць, як трагедыю адлюстроўваюць майстры, што не заспелі вайну, а ведаюць пра яе па ўспамінах старэйшых сваякоў.

— У маі ў Палацы мастацтва мы зладзілі вялікую выставу “Памяць пакаленняў”. Яна ўключала творы мастакоў старэйшага пакалення, сярод якіх мноства знакавых асоб. Мой бацька **Васіль Шаранговіч, Георгій Паплаўскі, Міхаіл Савіцкі** — яны гаварылі пра тое, што бачылі самі. Але цікава паказаць, як пра вайну распавядаюць наступныя пакаленні. І сімпозіум паслужыў штуршком да гэтай тэмы для цэлай кагорты графікаў. На мой погляд, вынік атрымаўся пераканаўчы. Работы ў розных стылях, але ў кожнай бачна арыгінальнае рашэнне, арыгінальная візуальная мова і эмоцыя, — падкрэсліла першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў **Наталля Шаранговіч**.

На прапанову паўдзельнічаць у праекце адгукнуліся дзесяць мастакоў. Кожны менш чым за месяц стварыў па дзве літаграфіі. **Юрый Крупянкоў** распрацоўвае ваенную тэму ўжо 25 гадоў. За гэты час у яго з’явілася даволі вялікая серыя жывапісных палотнаў, якую аўтар прэзентаваў у розных музеях краіны. Запрашэнне на сімпозіум па літаграфіі паслужыла мастаку цікавым выклікам і магчымасцю развіць знаёмую тэму ў іншай тэхніцы. На літаграфскім камені Юрый Крупянкоў намаляваў групу змучаных людзей. Каб выратавацца ад катаў, яны затаіліся ў хованцы, аднак не вытрывалі холад і голад. Прамень, што пракраўся ў падзямелле, асвятляе вялыя целы.

Своеасаблівым выпрабаваннем стаўся сімпозіум і для Алены Манько. “Тэмы маіх работ звычайна жыццесцвярджальныя, таму было няпроста пачаць, падняць страшны пласт мінулага. Блізкай мне аказалася гісторыя маленькіх чалавечкаў на вайне”, — падзялілася мастачка. Сімвалам пакут, якія выпалі на долю дзяцей, стаў плюшавы мядзведзь. У ліхалецце ён мог быць як суцішэннем для малых, так і зброяй супраць мірных грамадзян: захаваліся сведчанні, што акупанты начынялі цацкі ўзрыўчаткай.

Праблему загубленага вайной дзяцінства таксама адлюстравалі ў літаграфіях **Вольга Крупянкова** і **Андрэй Пяткевіч**, а **Ігар Гардзіёнак** і **Андрэй Басалыга** зафіксавалі на аркушы чалавека ў пераходным паміж двума светамі — жыццём і смерцю — стане.

Ваенная тэма дагэтуль застаецца адной з галоўных у беларускім мастацтве. Вядома, кожнае пакаленне творцаў раскрывае яе па-свойму. І нашы сучаснікі робяць акцэнт на філасафічнасці, пазбягаючы лжывага пафасу.

Зрэшты, ацаніць работы вы можаце самі: на пачатак снежня ў выставачнай зале імя Андрэя Бембеля запланавана часовая экспазіцыя па выніках сімпозіума. Таксама мяркуецца, што літаграфіі патрапяць і ў навастворaны музей у Хатыні.

Данііл ШЭЙКА
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Андрэй Басалыга
графік, намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў:

— Я ведаю пра вайну па аповедах бабуль і бацькі, маленства якога прыпала на тыя трагічныя гады. З мільёнаў такіх прыватных гісторый складваецца філасофская тэма сусветнага маштабу. Мы нават не задумваліся, што яна зноў можа стаць актуальнай. Чалавецтва паўтарае гэты жах раз на некалькі дзесяцігоддзяў, і трэба задумацца, чаму так адбываецца. Узяцца за ваенную тэму і не прапусціць праз сябе боль, не ўвабраць цяжкую энергетыку немагчыма. І мастакі, якія далучыліся да сімпозіума, зрабілі гэта свядома, бо большасць з іх не проста сталыя творцы. Тое людзі, якія маюць сем’і, дзяцей. Яны разумеюць каштоўнасць жыцця і ўяўляюць, як страшна раптам пазбавіцца ўсяго, чым мы даражым.

М. Абрыньба. “Пасля сыходу немцаў”, 1943 г.

Мастацкі летапіс трагедыі

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны знаходзіцца нямала мастацкіх твораў, прысвечаных генацыду нашага народа. Падрабязней пра калекцыю расказала намеснік галоўнага захавальніка фондаў Рыма Рум.

— Яшчэ ішла Вялікая Айчынная вайна, а ўжо арганізоўвалі наш музей. Многія мастакі працавалі адмыслова для экспазіцыі, шырока адлюстроўвалі зверствы гітлераўцаў на акупаванай тэрыторыі. Творы на гэтую тэму прадстаўлены ў сучаснай экспазіцыі ў зале “Нацысцкі акупацыйны рэжым у Беларусі”. Гэта работы Сяргея Раманава пра лёс савецкіх ваеннапалонных, карціна Ібрагіма Гембіцкага “Душагубка” — адна з нешматлікіх выяў машын смерці, якія аўтар бачыў у акупаваным Мінску. Таксама з 1940-х гадоў дайшло палатно Івана Ахрэмчыка “Твар ворага”, што экспанавалася ў Траццякоўскай галерэі. Распрацоўвалася і тэма знішчаных населеных пунктаў. У якасці прыкладу можна прывесці работы Мікалая Гуціева і Мікалая Абрыньбы, прысвечаныя спаленай вёсцы Слабодка ў Полацка-Лепельскай партызанскай зоне. Мастакі працавалі, можна сказаць, па гарачых слядах: выехалі на месца трагічных падзей, зрабілі фотаздымкі і замалёўкі.

1950—1960-я гады — гэта перыяд зацішша. Магчыма, яно здарылася, бо людзі жылі ўжо новымі мірнымі эмоцыямі і не хацелі думаць пра вайну. У той час Лазар Ран стварыў серыю “Мінскае гета”. Вяртанне да цяжкай тэмы адбылося ў 1970-я. І адносіцца яно да плеяды такіх таленавітых мастакоў, як Георгій Паплаўскі (серыі “Памяць” і “Час доўгіх нажоў”), Васіль Шаранговіч (“Памяці вогненных вёсак”) і Міхаіл Савіцкі (“Лічбы на сэрцы”).

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 48 / 26 ЛІСТАПАДА 2022 г.

Што схаванае пад слаямі сучаснай фарбы?

Як і чаму змяніў аблічча адзін з найстарэйшых будынкаў Мінска

Фасад былога бернардзінскага касцёла пасля рамонту

Хімікі тройчы выязджалі на аб'ект, адабралі болей за 50 проб фарбы. Але як суаднесці іх паміж сабою, каб выбудаваць храналогію? Бо самы ніжні слой далёка не заўсёды самы даўні

Мала якія работы на помніку спадчыны выклікаюць такі рэзананс, як яго афарбоўка ў іншы колер — адрозны ад звыклага нам з дзяцінства. Па прыклады далёка хадзіць не трэба. Убачыўшы "новы" фасад колішняга бернардзінскага касцёла (цяпер гэта Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва), многія мінчукі сказалі "ваў" — хто з ухвалай, а хто і з абурэннем.
Пра тое, чаму адзін з самых старых будынкаў Мінска кардынальна зміняў аблічча, мы гутарым з навуковым кіраўніком згаданых работ, архітэктарам-рэстаўратарам Раманам ЗАБЕЛАМ.

— Ці не бянтэжыць, што плён вашай працы людзі ўспрымаюць часцей за ўсё з пункту гледжання "карцінкі" — падабаецца або не?

— Не бянтэжыць, але я сам такі падыход сабе дазволіць не магу. Рэстаўратар павінен прымаць навукова абгрунтаваныя і максімальна аб'ектыўныя рашэнні, а не дзейнічаць паводле ўласных уяўленняў пра харастро. Менавіта гэтым рэстаўрацыя адрозніваецца ад архітэктурнай творчасці. На любое пытанне, якое да цябе можа ўзнікнуць, ты мусіш мець аргументаваны адказ, пацверджаны комплекснымі даследаваннямі помніка.

Хаця мушу дадаць, што ў дадзеным выпадку архіўныя або фізіка-хімічныя даследаванні не прадугледжваліся: паводле будаўнічых нарматываў, бягучы рамонт фасада — а гутарка, уласна, пра яго — іх не вымагае.

— Адпаведна, рамонтныя работы ў Міністэрстве культуры не ўзгадняліся?

— Вядома ж, узгадняліся. Сапраўды, такія работы не патрабуюць распрацоўкі праектнай дакументацыі, але атэставаны міністэрствам навуковы кіраўнік павінен скласці абгрунтаваную праграму работ, пакрокава пералічыўшы свае методыкі, а таксама матэрыялы, якія будуць прымяняцца. Там даволі шмат літар, як цяпер кажуць.

Нават пры тым, што ад пачатку наша задача была сціплай: падтрымаць эксплуатацыйныя вартасці будынка і, галоўнае, не нашкодзіць. Не парушыць аўтэнтычныя элементы, не прымяніць тыя матэрыялы, якія стануць для помніка згубнымі.

— Чаму ж вы наважыліся на куды большае? І якое дачыненне да бягучага рамонту мае адналенне гістарычнага колеру фасадаў?

— Так, можна было проста яшчэ раз яго пафарбаваць, не болей за тое. Але перад тым як накладаць новы слой фарбы, паводле тэхналогіі неабходна счысціць папярэднія. Інакш ніяк: па-першае, на касцёл былі нанесеныя сучасныя акрылавыя фарбы — а гэта свайго кшталту цэлафанавая плёнка, у якую загорнуты старадаўні будынак. Зразумела, яна спаквіла яму шкодзіць. А па-другое, мінулыя слаі не тое каб добра трымаліся, і новая фарба паверх іх проста б нармальна не лягла, гэта былі б выкінутыя на вецер грошы.

Уласна, я да чаго: з'явілася ўнікальная магчымасць даведацца, што ж там схаванае пад слаямі фарбы...

— Выключна цікаўнасць?

— Не толькі. Працуючы на такім аб'екце, адчуваеш вялікую адказнасць — не толькі як рэстаўратар, але і як жыхар гэтага горада. Да ўсяго і заказчык быў максімальна зацікаўлены ў правядзенні якасных работ: супрацоўнікі архіва вельмі любяць свой будынак і разумеюць яго значнасць для Мінска, што адчувалася і матывавала.

Адпаведна, перад тым як фарбаваць, мы вырашылі паразважаць: а раптам пад слоем фарбы ёсць роспісы? Гіпотэза досыць імаверная: адносна нядаўна на фасадзе касцёла ў Нясвіжы былі знойдзеныя паліхромныя выявы, ды і мінская Свята-Духаўская царква, паводле апісанняў, мела мазаікі. Для архітэктуры таго часу такое аздабленне было справай звыклай.

І паколькі фасад бернардзінскага касцёла раней грунтоўна не даследаваўся, мы настаялі, каб рабочыя перад тым, як счышчаць фарбу, выклікалі навуковага кіраўніка. Раптам на сцяне выявяцца нейкі невядомы нікому жывапісны шэдэўр! Тады трэба неадкладна спыніць працы.

У мяне была магчымасць падняцца на вышэйшы, даследаваць фасад ва ўсю яго вышыню. Дарэчы, надарылася яна толькі ў другі раз за ўсю шматгадовую гісторыю храма (мінулая была падчас рэстаўрацыі ў 1980-я). Грэх было не скарыстаць.

Што ж, жывапісных элементаў выявіць не ўдалося — або, магчыма, яны былі знішчаныя падчас папярэдніх рамонтаў. Пад двума апошнімі слаямі акрылавай фарбы адкрылася голая тынкоўка. Аднак, прыгледзеўшыся, я заўважыў: сям-там у яе ўеліся рэшткі старых фарбаў — скажам, у нішы або на карнізах. Гэта ўжо важная знаходка.

Паводле метадалогіі, у той сітуацыі, калі мы не маем магчымасці правесці даследаванні, аб'ект трэба наогул не чапаць: спыніць работы і чакаць фінансавання. Але ж у дадзеным выпадку нават гаворкі пра гэта не было: будынак жа знаходзіцца ў цэнтры горада і мусіць выглядаць прэзентабельна.

Таму, параіўшыся з калегамі і разумеючы ўнікальнасць ды адказнасць сітуацыі, мы вырашылі зрабіць даследаванні за кошт нашага рэстаўрацыйнага цэнтра. У нас ёсць свая лабараторыя і адпаведныя спецыялісты, таму дзейнічаць мы маглі вельмі хутка, не парушаючы тэрмінаў выканання работ.

Нашы хімікі тройчы выязджалі на аб'ект, адабралі болей за 50 проб фарбы. Але як суаднесці іх паміж сабою, каб выбудаваць храналогію? Бо самы ніжні слой далёка не заўсёды самы даўні: недзе падчас рамонтаў счысцілі першую фарбу дазвання, а сям-там трохі яе засталося. Прыкладам, у некаторых месцах першым слоем быў блакітны, і мы нават дапускалі, што напачатку касцёл меў менавіта такі колер — для барока гэта таксама ўласціва.

— Адпаведна, сёння гэты будынак мог бы быць блакітным?

— Чаму не? Але ўрэшце хімічны аналіз расставіў усе кропкі над "і": выявілася, што блакітнай была ўжо пабелка 1930-х гадоў.

— Няўжо паводле дробных фрагменцікаў вам удалося аднавіць увесь каларыт фасада?

— На 100 % упэўненым ніколі нельга быць, але мушу сказаць, што ў дадзеным выпадку каляровае рашэнне вымалевалася даволі адназначна. Выключэнне — гэта, вядома, барочны шчыт, аднаўлены ўжо ў 1980-я. Калі мы (амаль) упэўненыя, што ніжэй за карніз колеры адпавядаюць гістарычным, то ў выпадку шчыта гэта ўжо рэканструкцыя — як, зрэшты, і ён сам.

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 48 / 26 ЛІСТАПАДА 2022 г.

— Але адкуль такая ўпэўненасць? Асабліва калі ўлічыць, колькі часу мінула...

— У выніку скрупулёзных даследаванняў мы выявілі колер кожнага з элементаў фасада. Што цікава, акрамя традыцыйнага вохрыстага, там ужываліся таксама тэракотавы і чорны. Пагадзіцеся, для каларыту сённяшняга горада гэта даволі нязвыклка.

— Менавіта чорныя ўстаўкі, здаецца, і выклікалі найбольшы розгалас...

— Аднак я магу прадэманстраваць фота, дзе такая фарба праглядаецца. Прычым відавочна, што гэта не наступствы пажару, а менавіта адзін з афарбовачных слаёў, на ім нават відаць сляды ад пэндзля, які трымаў майстар XVII стагоддзя.

— Ці ўзгаднялася змена аблічча будынка ў Міністэрстве культуры?

— Натуральна. Калі ў праграму работ уносяцца нейкія змены, іх таксама неабходна ўзгадніць, а па завяршэнні прац робіцца датклівая справаздача. Прычым мы ад пачатку прадугледжвалі магчымасць карэкціроўкі ў тым выпадку, калі будуць атрыманыя новыя звесткі, — што і адбылося. Прапанова па аднаўленні гістарычнага каларыту фасада была вывучаная спецыялістамі міністэрства, і яны прынялі нашыя аргументы. Зразумела, гэта адбылося перад тым, як пачаліся работы па афарбоўцы.

Усе пагадзіліся ў адным: так, можна пафарбаваць фасад у ранейшы колер, які быў адвольна абраны гадоў дзесяць таму. Але чаму б не вярнуць яму гістарычны? Пагатоў гэта амаль не павялічвала бюджэт работ: фарбу ж так ці інакш трэба купляць, і ці вялікая розніца, аднаго яна будзе колеру або чатырох?

— Розніца хіба ў тым, што да белага колеру былога касцёла ўсе ўжо прызвычаіліся. Ён нібыта адбіўся на сятчатцы вока кожнага з мінчукоў — не кажу ўжо пра турыстычныя буклеты.

— Так, але ж мы прызвычаіліся да таго колеравага рашэння, якое з'явілася пасля апошняга рамонту. У 1980-я касцёл меў два колеры — жоўты з белымі пілястрамі, пасля ён быў перафарбаваны ў суцэльны белы, потым у два нюансныя колеры... Як мы бачым, нават цягам апошніх дзесяцігоддзяў колеравае рашэнне неаднаразова мянялася. Адпаведна, наўрад ці пра яго можна казаць як пра нейкую гістарычна абумоўленую канстанту.

— Яшчэ адзін немалаважны нюанс. Мяркую, аднаўленне "гістарычнай справядлівасці" хоцькі-няхоцькі павінна візуальна дапасоўвацца да ўжо існага асяроддзя — а яно з XVII стагоддзя моцна змянілася. Ці ўлічваўся і гэты аспект?

— Вядома. З асноўных пунктаў агляду касцёл бернардзінцаў стаў адзіным ансамблем з іх жа кляштарным комплексам, дзе рэстаўрацыйныя работы былі праведзеныя раней, і падчас іх, мяркуючы па ўсім, будынкам удалося вярнуць гістарычны каларыт. Белы касцёл у гэтым ансамблі выглядаў дысанансна, але цяпер, здаецца, удалося дамагчыся пэўнай цэласнасці.

— Дарэчы, ці настолькі важна любой цаной вярнуць менавіта першасны колер?

— Зусім не. Пры рэстаўрацыі няма задачы вярнуць будынку яго адпачатнае аблічча. Наадварот, мы павінны ўлічваць усе часавыя і стылістычныя напластаванні, максімальна выяўляць гісторыю аб'екта, паказваць тое вартае, што з'яўлялася ў кожны перыяд яго існавання. Каларыт — таксама адна з адметных вартасцей помніка.

Фасад былога бернардзінскага касцёла да рамонту

У выніку скрупулёзных даследаванняў мы выявілі колер кожнага з элементаў фасада. Што цікава, акрамя традыцыйнага вохрыстага, там ужываліся таксама тэракотавы і чорны.

У кожную эпоху была свая мода. Скажам, касцёл Святога Станіслава ў Магілёве ў часы барока меў даволі яркую афарбоўку, аднак пасля на змену прыйшоў класіцызм — што адбілася не толькі на архітэктуры, але на колеры фасада.

Але гэта не пра наш выпадак. Касцёл бернардзінцаў меў толькі адну перабудову — пасля пажару ў сярэдзіне XVIII ст. Праз сто гадоў будынак касцёлам быць перастаў, а ўсе наступныя змены не ўтрымлівалі ніякіх аўтарскіх рашэнняў — і, адпаведна, архітэктурнай або гістарычнай каштоўнасці. Хутчэй, гэта была паступовая дэградацыя помніка: знеслі бакавыя франтоны, потым верхні шчыт, потым замуравалі нішы... Тое самае тычылася і выбару каларыту: ён не меў мэтанакіраваных стылістычных рашэнняў. Цягам двух з паловай стагоддзяў рабіліся проста ўтылітарныя рамонты: каб было чысценька і прыгожа. А які колер абраць, ніхто надта і не задумваўся.

Сітуацыя пачала мяняцца толькі ў 1980-я, калі быў адноўлены франтон — паводле ўзору касцёла ў Барунах. Тады ж у правай нішы, замураванай раней, была выяўленая гіпсавая скульптура манаха — пашкоджаная, без галавы і рук. Куды яна падзелася, я пакуль не высветліў. Ёсць пагалоска, што яе проста разбілі з ідэалагічных перакананняў. Але ў такое варварства нешта не верыцца: хутчэй за ўсё, артэфакт перадалі ў фонд нейкага музея. Калі ён знойдзецца, будзе падстава тыя скульптуры аднавіць.

Дый і наогул на фасадзе касцёла працы яшчэ ўдосталь. Гэтым разам мы адкрылі "родны" арачны праём, але ж можна аднавіць і страдаўнія драўляныя дзверы. Варта адрэстаўраваць вялікае акно — я аналізаваў гістарычныя фота і выявіў, што на мяжы XIX і XX стагоддзяў яно ўжо было. Плюс страчаныя архітэктурныя элементы — карнізы, дэкор... Мы ў рамках рамонту правялі хіба мінімальныя работы, пакінуўшы шмат прасторы для дзеянняў будучым рэстаўратарам.

— Помнік спадчыны ў цэнтры сталіцы, вядома, не застанецца па-за ўвагай. Але не раз даводзілася сутыкацца з такой сітуацыяй: звычайную старасвецкую камяніцку, у якой знаходзіцца, скажам, музей або школа мастацтваў, у рамках бягучага рамонту пафарбавалі. І вось дырэктар скардзіцца: прайшоў які год — і ўсё лупіцца... Які алгарытм дзеянняў вы б яму параілі?

— Найперш адну вельмі простую рэч: пракансультавацца са спецыялістамі, хаця б па тэлефоне. Паверце, людзі, якія працуюць са спадчынай, — гэта зазвычай заўзятары сваёй справы, і таму яны не адмовяць у парадзе нават "за дзякуй". Асабліва калі разумеюць, што памылка можа прывесці да непапраўных наступстваў. Прынамсі, проста падкажуць, якую фарбу купіць.

— Часты аргумент — недастаткова сродкаў, таму фарбу даводзіцца купляць самую танную...

— Аднак у каштарысе рамонту фарба займае далёка не самую верхнюю пазіцыю: куды даражэй абыходзіцца арэнда тэхнікі, рыштаванні, урэшце, сама праца... А цяпер глядзіце: калі матэрыял падабраны правільна, ён не будзе лупіцца і выгараць. І тады фасад прастаіць не пяць гадоў, як належыць па нарматывах, а ўсе пятнаццаць — што ў не такой і доўгай перспектыве дазволіць акурат такі эканоміць. Разлік тут элементарны.

То-бок не бойцеся звяртацца па кансультацыі! І ні ў якім разе не парушайце тэхналогіі. Дастаткова ўвесці ў рамонтную сістэму адзін няправільны матэрыял — і гэта выкліча праблемы "на ўсё жыццё".

Прыкладам, падмуркі старадаўніх будынкаў у нас чамусьці ўмацоўваюць цэментам — не адзін раз бачыў! Я пытаюся ў пробашча касцёла: навошта? Той кажа: дык будаўнікі, якіх я наняў, так зрабілі, бо прызвычаіліся... Ну, прызвычаіліся. Але ж простыя будаўнікі не ведаюць, што вапнавая кладка з цэментам не стасуецца. У выніку гэта выклікае цыклічнасць праблем: кожны год нешта будзе адвальвацца, давядзецца падмазваць зноў. Эканомілі, называецца.

— Многім памятны выпадак з вазамі на праспекце, якія раптоўна сталі жоўтымі — што спарадзіла розныя жарты і мемы. Цікава, як наогул такое здараецца?

— Вазы, дарэчы, жоўтымі былі і раней, але колер, як вядома, мае розныя адценні... Гэта таксама быў звычайны рамонт, і эксплуатуючая арганізацыя афарбоўку ні з кім не ўзгадняла. Вось і патрапілі трохі... Канешне, калі б у гэтай справе ўдзельнічаў спецыяліст — як тое, дарэчы, і належыць — перафарбоўваць бы потым не давялося. Пагатоў па тых вазах былі некалі праведзеныя фізіка-хімічныя даследаванні, інфармацыя чакала свайго часу ў архівах. Калі б алгарытм прыняцця рашэння не быў парушаны, можна было б без праблем аднавіць гістарычны колер — што, уласна, і было зроблена праз два гады, ужо пасля таго, як справа стала рэзанансная.

— І апошняе пытанне. Наколькі важна адмыслоўцу прыслухоўвацца да эмацыйных рэакцый мінакоў на яго працу?

— Канешне, важна! Тое, што ёсць рэакцыя, — гэта ў кожным разе файна: значыць, людзям не абыякава, як змяняецца іх горад. Спадзяюся, яны выслухаюць нашы аргументы і зразумеюць, чаму мы настолькі ўпэўненыя ў прынятых рашэннях. Тут можа быць адукацыйны аспект — ці, прынамсі, нагода для рэфлексій. Мы спакваля разумеем, што архітэктурныя помнікі не з'яўляюцца нейкай канстантай — цягам сваёй гісторыі яны несупынна мяняюцца. І трэба разумець, як гэта адбывалася і адбываецца. Бываюць змены, якія ўзбагачаюць архітэктуру — нейкія аўтарскія перабудовы, а ёсць банальнае спрашчэнне або проста недасведчанасць.

Той самы былы касцёл — добры прыклад, как праілюстраваць гэтыя працэсы. Паказаць, што гістарычны каларыт Мінска некалі быў іншым — куды ярчэйшым, што наогул было ўласціва еўрапейскім гарадам.

Гэты прыклад можна выкарыстоўваць для абмеркавання гістарычнага каларыту іншых аб'ектаў, каб паказаць, што гарадскі кантэкст больш складаны, чым нам уяўляўся, не такі аднародны. І ён можа выглядаць для нас нязвыкла.

Зрэшты, дыскусія патрэбная і самім адмыслоўцам. Згадайма той кур'ёзны выпадак, калі Чырвоны дворык у Мінску хацелі перафарбаваць у ружовы колер — больш гістарычны. Грамадскасць адразу ўзбурапенілася. І стала зразумела, што каштоўнасць каларыту (які, па праўдзе кажучы, з'явіўся выпадкова) значна большая, ніж аднаўленне "гістарычнай справядлівасці". Адсюль можна вынесці новыя для сябе высновы: "дададзеная вартасць" помніка часам з'яўляецца літаральна на вачах. Таму дыскусія наогул важная не толькі для асветы іншых, але і для таго каб самім вучыцца — што нікому ніколі не зашкодзіць.

Ілья СВІРЫН

Маскоўскія “неканікулы”

Студэнты-акцёры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Беларусі, прафесара Уладзіміра Мішчанчука зрабілі фурор у Маскве на V Тэатральным фестывалі краін СНД “ГИТИС – мастер-класс”.

— Падчас заняткаў я заўсёды імкнуся максімальна далучыць студэнтаў да ўдзелу ў замежных майстар-класах, фестывалях, іншых творчых акцыях і праектах, — распавёў Уладзімір Мішчанчук. — Вось і цяпер, калі я яду трэці курс спецыяльнасці “Акцёрскае мастацтва (драматычны тэатр і кіно)” дзённай формы навучання, як толькі з’явілася інфармацыя Расійскага інстытута тэатральнага мастацтва пра гэты форум, мы даслалі заяўку. Хваляваліся, чакалі, бо арганізатары самі адбіраюць удзельнікаў сярод ахвотнікаў. Першая радасць была, калі атрымалі запрашэнне. Другая — ад самой паездкі. І, безумоўна, вельмі прыемна, што паказаны намі спектакль — “Гульні на заднім двары” — сабраў добрыя водгукі. За поспехам стаіць вялікая праца ўсіх, хто спрычыніўся да пастаноўкі, і найперш рэжысёра-педагога Віталя Краўчанкі, педагога па майстэрстве акцёра Людмілы Кучарэнка, харэографа Дар’і Карпячэнкавай — нашай выпускніцы, якая і сама з’яўляецца выдатнай артысткай, працуе ў Тэатры-студыі кінаакцёра. Для творчай моладзі такія паездкі вельмі важныя. Можна і сябе паказаць, і пачуць водгукі збоку, якімі б яны ні былі. Канструктыўныя заўвагі такія ж неабходныя, як і словы падзякі. Уражанняў у студэнтаў — нават не мора, а цэлы акіян. Некаторыя ўпершыню ўбачылі Маскву, і выдатна, што арганізатары заўжды робяць экскурсіі па горадзе. А былі ж яшчэ ўласна тэатральныя экскурсіі! Мы наведалі МХАТ, Дом-музей Станіслаўскага. Але галоўнае — гэта майстар-класы вядучых расійскіх спецыялістаў, прагляд спектакляў гаспадароў і іншых удзельнікаў фестывалю — у тым ліку з Арменіі, Азербайджана, Казахстана, Кыргызстана, Узбекістана. Вярталіся папраўдзе натхнёнымі, з жаданнем зрабіць яшчэ больш і лепш.

Да расказанага У. Мішчанчуком дадам дзве дэталі, на маю думку, надзвычай істотныя. Яны спрыяюць не толькі прафесійнаму росту студэнтаў, але і выхаваўчаму працэсу як неад’емнай частцы педагогікі. Першая дэталь — удзел у спектаклі самога кіраўніка. Нароўні са студэнтамі, у ролі Суддзі. Гэта ж дадатковы майстар-клас! І стаўленне да навучэнцаў як да малодшых калег. Другая дэталь — выбар п’есы сучаснага ізраільскага драматурга і рэжысёра Эдны Мазія, дзе ўзнімаецца вострая моладзевая праблематыка: невыпадкова спектакль азначаны па жанры як “драма сталення”. Гэта менавіта тое, чаго так нестае сёння нашым тэатрам. І што так запатрабавана грамадскасцю — асабліва калі мы хочам прыцягнуць новае пакаленне і выхаваць яго не толькі на камедыях, але і на сур’ёзных спектаклях, якія заклікаюць да роздуму.

Надзея БУНЦЭВІЧ

У Беларускім тэатры “Лялька”, што ў Віцебску, прадставілі спектакль “Кацёл з каменьчыкамі” па казцы Уладзіміра Караткевіча.

Каменьчыкі прэм’еры і дэбюту ў адным “Катле...”

У гэтым творы — гістарычная памяць беларусаў пра цяжкае пасляваеннае жыццё. І пра бульбу, што не аднойчы ратавала нашу краіну ад голаду. Мая маці расказвала, як яны з братам збіралі ўвесну перамёрзлыя клубні на калгасным полі. Тое была самая смачная страва на свеце! Бабуля гатавала яе сваім шасці дзецям, перамешваючы бульбу з вотруб’ем. А дзядуля, як і ў казцы Караткевіча, загінуў на вайне.

Сведкам тых падзей стаў і мастацкі кіраўнік тэатра Віктар Клімчук — вялікі аматар творчасці Уладзіміра Караткевіча. Ён даўно ўключыў у планы калектыву гэтую інсцэніроўку, і ператварыла задуму ў жыццё актрыса “Лялькі” Марыя Кавалёва, якая вучыцца ў Санкт-Пецярбургу на рэжысёра. Спектакль для яе як для пастаноўшчыка — дэбют.

— Звярнуцца да гэтага твора было для мяне ганарова і адказна, — расказала Марыя напярэдадні прэм’еры. — Я вельмі ўдзячная ўсім, хто дапамагаў, падказваў. Тэма казкі блізкая і мне асабіста. Я са шматдзетнай сям’і, нас у мамы, як і ў аповедзе, было пяцёра. І пытанне, чым накарміць дзяцей, гучала ў нашай хаце даволі часта. Так што гераіня спектакля ў выкананні Вольгі Лазебнай мае рысы і маёй мамы.

Харэографам выступіла Дзіяна Юрчанка. Яна стварыла адмысловы пластычны малюнак, што ўдыхнуў у дзеянне дадатковы падтэкст. У рухах Чараўніка (Сяргей Талкач) праглядаюцца і індаеўрапейскія матывы, і сілавыя пасы цыгун, і нешта невядомае нават дасведчанаму гледачу. Аблічча гэтага героя, яго манера размовы і рухі ствараюць яскравы вобраз ці то іншаземнага валацугі, ці то — сына Божага, які выпадкова завітаў у гаротную вёску. Бо персанаж і ёсць тая найвышэйшая сіла, што змагаецца з несправядлівасцю — галоўным грахом на зямлі для Караткевіча.

Інсцэніроўку зрабіла Вольга Прусак, якая даўно супрацоўнічае з “Лялькай” і стала адным з яе пастаянных аўтараў. Для п’есы драматург абрала строгі кампазіцыйны лад і выразнасць трох цэнтральных вобразаў, пакінуўшы спасылку да ўзораў найлепшых старажытных трагедый.

Лялькі, касцюмы і сцэнаграфія Дар’і Дубовік — лаканічныя, прасякнутыя сярэднявечнай метафарычнасцю, якая дае волю ўяўленню гледача. Нехта ўбачыць на сцэне старажытную вёску, што збяднела і прыйшла ў заняпад. А іншы расчытае сімвал казачнага краю з блакітным возерам-катлом у цэнтры.

У гэтым катле-возеры Марыя варыць каменне, каб прыспаць галодных дзяцей. А Чараўнік ператварае каменьчыкі ў бульбу. Рэжысёру ўдалося так візуалізаваць апісаную сцэну, што мы літаральна адчуваем водар маладой бульбы з кропам — пах, які летнім ранкам лунаў і ў маёй роднай хаце.

Аўдыяльнае атачэнне стварыў гукаапаратар Мікіта Гушчанка, надаўшы дзеянню рысы своеасаблівай беларускай рапсодыі. Да таго ж ён выкарыстаў запісы дуды і абертонавай флейты. Выканаўца мелодый — Герман Бандарэнка з Сенненскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці — даўно цікавіцца этнічнай музыкай, збірае народныя музычныя інструменты розных краін.

У новым спектаклі ёсць і смех, і слёзы. І роздум пра тое, што ўсё ж не ў бульбе наша нацыянальная ідэя. Духоўныя карані беларусаў — гэта свядомасць, дабро, цярплівасць. І вялікая гістарычная памяць, афіцыйна абвешчанаму Году якой і прысвечана прэм’ера. Менавіта гэтым жыве наша краіна — і будзе жыць вечна.

Жанна ІВАНОВА, Віцебск

СТУЖКА ЖЫЦЦЯ

АЎТОГРАФ З БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

Міхась Філіповіч

1896—1947 гг.

Беларускі савецкі мастак, графік і этнограф, які адным з першых звярнуўся да айчыннай нацыянальнай тэматыкі.

Творца зрабіў вялікі ўнёсак у захаванне нацыянальнай культурнай спадчыны. Замалёўкі ткацкіх узораў, разьбы, народных строяў, сялянскіх забудоў і прадметаў побыту прадстаўляюць вялікую цікавасць для этнографаў і даследчыкаў славянскай культуры і сёння. Алейныя карціны Міхася Філіповіча вылучаюцца яркім нацыянальным каларытам і самабытнасцю.

У 1939 годзе скульптар Меер Айзенштат увекавечыў аблічча мастака, стварыўшы бюст. У 1946-м Йўген Красоўскі напісаў партрэт Міхася. У 2002 годзе Белпошта выпусціла марку з выявай карціны Філіповіча “Бітва на Нямізе”, а ў 2021-м — канверт з арыгінальнай маркай “Жывапіс. Міхаіл Мацвеевіч Філіповіч. 1896—1947”.

Значная частка спадчыны майстра захоўваецца ў Беларусі.) Нацыянальным мастацкім музеі да леташняй выставы ў гонар 125-годдзя Міхася Філіповіча было падрыхтавана 150 фотаздымкаў, твораў жывапісу, графікі, скульптуры з мінскіх музеяў і прыватнаю зборау. Шмат карцін Міхаіла Мацвеевіча знаходзіцца на тэрыторыі сучаснай Расіі. Вялікая колькасць работ была страчана.

1896 г. Нарадзіўся 8 чэрвеня ў Мінску ў селянскай сям’і. У чатыры гады згубіў бацьку. Далей хлопца выгоўвае родны дзядзька.

Дмітрый Полазаў

1910—1917 гг. Праходзіць падрыхтоўку ў Мінскім рэальным вучылішчы. Настаўнікі — Д. Полазаў, К. Ермакоў. Падчас Першай сусветнай вайны ўстанова эвакуіруецца спачатку ў Гжацк, потым у Маскву, а пазней у Яраслаўль, дзе мастак нарэшце заканчвае вучобу.

1918—1920 гг. Жадаючы працягнуць мастацкую адукацыю, адпраўляецца ў сталіцу Расіі. Вучыцца ў Маскоўскім гранічным інстытуце і ў прыватнай студыі А. Хатулёва.

“На Купалле”, 1921 г.

1921—1922гг. Вяртаецца ў Мінск, дзе з 13 работамі ўдзельнічае ў першай савецкай выставе горада. Пасля арганізуе дзбютную персанальную экспазіцыю.

Роберт Фальк

Аляксандр Дрэвін

1923—1925 гг. Працуе загадчыкам мастацкага аддзела ў Беларускім дзяржаўным музеі. У Вышэйшых тэхнічных майстэрнях вучыцца ў Аляксандра Дрэвіна і Роберта Фалька. Летам падарожнічае па Беларусі ў складзе этнаграфічнай экспедыцыі.

1927—1929 гг. Член Усебеларускага аб’яднання мастакоў. Прымае ўдзел у міжнародным экспазіцыі “Мастацтва кнігі” ў Лейпцыгу, а таксама ў III Усебеларускай мастацкай выстаўцы, дзе дэманструе каля 40 карцін, у тым ліку і “Бітву на Нямізе”.

1947 г. Апошнія дні жыў і працаваў у Маскве, там і памёр. Дакладны дзень, абставіны скону і месца пахавання невядомы.

Пачатковую адукацыю з’рымлівае ў царкоўна-прыходскай школе.

“Стары пастух з рогам”, 1-я палова 1920-х гг.

Ужо ў гэты перыяд творца цікавіцца старажытнымі помнікамі архітэктуры, нацыянальным адзенням і ладам жыцця славян і мімаволі прыкмячае асаблівасці беларускай культуры. Пасля навучання вяртаецца ў Мінск, дзе стварае замалёўкі вуліц Старога горада. На жаль, гэтыя працы не захаваліся. Паступова набірае ход беларусізацыя, і мастак уключаецца ў краязнаўчую плынь.

“Партрэт Міхаіла Мацвеевіча Філіповіча”, Міхаін Станюта, 1925 г.

1919—1920 гг. Залічваецца ў Дзяржаўныя вольныя мастацкія майстэрні, аднак надоўга ў іх не затрымліваецца і ідзе добраахвотнікам у “Чырвоную гвардыю, у якой на працягу года служыць санітарам цягніка на дзянікінскім фронце. Праз дрэннае здароўе едзе ў Маскву ў Вышэйшую школу ваеннай маскіроўкі, дзе вучыцца 11 месяцаў. У канцы 1920-га Камісія па таленавітасці накіроўвае творцу ў Дзяржаўныя вольныя мастацкія майстэрні, дзе той пераймае веды ў Канстанціна Каровіна.

У гэты час у творчасці мастака ўжо заўважная цікавасць да нацыянальнага фальклору. Беларуская тэматыка яскрава адлюстроўваецца ў карцінах “На Купалле”, “Карагод (Лялькі)”, “Казачны сюжэт” і іншых.

Канстанцін Каровін

“Бітва на Нямізе”, 1922 г., Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

1930-я гг. У гэты час у БССР ўсё часцей крытыкуюць творчасць Міхаіла Філіповіча. Карціны мастака здымаюць з экспазіцый Беларускага дзяржаўнага музея, самога творцу абвінавачваюць у “нездзмаўлучнае”, “фармалізме” і адказоўдзе ад разумення сутнасці класавай барацьбы. У асяродзі інтэлігенцыі набіраю абароты махавік рэпрэсій. Імкнучыся іх пазбегнуць, жавапісец едзе разам з жонкай Ксеніяй Весялоўскай у Маскву, дзе ўступае ў Асацыяцыю мастакоў рэвалюцыйнай Расіі, а пазней выпраўляецца ў Сярэдняю Азію. Там працуе мала, бо займаецца мастацкім афарміленнем фабрык і заводаў, малюе плакаты і лозунгі для друку. Знаходзячыся ва Ўзбекістане, стварае некалькі палотнаў, якія трапяць у Трацяковскую галерэю.

“Беларуска”, 1921 г.

1939—1945 гг. У 1939-м вяртаецца ў Мінск, дзе піша карціны на сацрэалістычную тэматыку, паралельна стварачы альбомы этнаграфічных замалёвак і жывапісных палотнаў пра Купалле. Падчас Вялікай Айчыннай кампіроўваецца ў Маскву. Там робіць мастаком беларускага сатырычнага часопіса “Партызанская дубінка”, служыць франтавым мастаком у арміі. Напрыканцы вайны, пасля вызвалення Мінска, становіцца загадчыкам мастацкага аддзела Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Супрацоўнічае з Музеем ВАВ і Домам народнай творчасці, для якога афарміляе 10 альбомаў, прысвечаных матэрыяльнай народнай спадчыне.

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 48 / 26 ЛІСТАПАДА 2022 г.

“Вялікага дуба з малым карэннем не бывае”, — сведчыць народная мудрасць. Сапраўды, любы народ моцны гістарычнай памяццю і зберажэннем традыцый. А пачэсная місія ўстаноў культуры — у захаванні і перадачы здабытага наступнаму пакаленню. І яны гэтую місію годна выконваюць.

Народныя традыцыі і рамёствы Шчучыншчыны

Скарбы вясковых куфараў

Дзень без тытуню

Карэнне і крона

ВЯРТАЦЦА ДА ВЫТОКАЎ

Народныя традыцыі і рамёствы Шчучыншчыны сталі тэмай выязнога пасяджэння краязнаўчага клуба раённай бібліятэкі, якое прайшло ў музейным пакоі аддзела рамёстваў раённага цэнтра культуры і народнай творчасці. Там можна было паглядзець на вынік працы мясцовых умельцаў — дываны, куфры, шалестуны, прасы, посуд, кросны, вышыванкі. Як піша **Тамара Менская**, бібліятэкар аддзела абслугоўвання Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі, для многіх гэта была вандроўка ў дзяцінства. А напрыканцы гаспадары — Вольга Роліч і Таццяна Лебядзевіч — зладзілі яшчэ і майстар-клас па вырабе каляднага анёла. І ён, створаны рукамі, паляцеў у кожны дом.

Скарбы вясковых куфраў разглядалі ўдзельнікі мерапрыемства ў сельскай бібліятэцы аграгарадка Навасёлкі, што на Ашмяншчыне, у межах раённага конкурсу “Бібліятэка — тэрыторыя захапленняў” на найлепшую пастаноўку аматарскага аб’яднання. Пра гэта нам паведаміла **Кацярына Чайкоўская**, супрацоўнік аддзела бібліятэчнага маркетынгу Ашмянскай раённай бібліятэкі.

Хрысціна Башарымава, вядучы рэдактар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы, расказала, што ў рамках Міжнароднага навукова-практычнага семінара “Захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны краін СНД у кантэксце глабальных выклікаў” узоры фальклорнай ансамбль “Купалачка” клічаўскай школы мастацтваў паказаў дзіцячы калядны абрад “Куры”, што праводзяць на Святкі. Гэта адзіны дзіцячы абрад, які захаваўся на тэрыторыі Магілёўскай вобласці, яго ўдзельнікам ад 6 да 14 гадоў.

Як паведаміла **Ірына Цыганова**, загадчык аддзела традыцыйнага мастацтва і рамёстваў Палаца мастацтваў Бабруйска, майстар народных промыслаў гэтай установы, член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Любоў Гарбар прадэманстравала педагогам дзіцячага садка № 66 асновы выразання выцінанак і падзялілася сакрэтамі сваёй творчасці.

Работнікі Цэнтралізаванай клубнай сістэмы Краснапольскага раёна ў межах арт-праекта “Фальклорны жыццявір” працягваюць знаёмства з найлепшымі практыкамі клубных установ рэгіёна па захаванні і папулярызацыі фальклорна-этнаграфічнай спадчыны. У атмасферу народнай мудрасці і прыгажосці дазволілі заглыбіцца “Пілігаўскія вячоркі”, што прайшлі ў **Пачапоўскім сельскім Доме культуры**. Былі там і аўтэнтычныя мясцовыя песні пад сакатанне пралкі, і прысмакі. А супрацоўнікі **Казельскага сельскага клуба** пабудавалі сваю праграму на матэрыяле свята Юр’е. Яны сабралі нямала прыкмет, прымавак і прыказак, гульняў, абрадавых дзей. Метадыст Цэнтралізаванай клубнай сістэмы Краснапольскага раёна **Валянціна Марчанка**, распрацоўшчык арт-праекта і аўтар допісу ў рэдакцыю, нават склала верш: “Усё сваё — і песні, і абрады, // І сакатанне пралкі, і ручнік, // Смакуем дранікі і вельмі рады, // Што сакавіты наш фальклор не знік. // Нішто так моцна сэрца не кранае, // Як спеў матулі, хлеб на ручніках. // Усё сваё, яно нас і яднае, — // І нас, і продкаў, што жылі ў вяках”.

КАБ ПАМЯТАЦЬ

Выставу “Сёстры Хатыні. Гродзеншчына”, якая ладзілася ў Лідскім гісторыка-мастацкім музеі, паведалі навучэнцы сярэдняй школы № 11 Ліды. Гэта сумесны праект Пракуратуры Гродзенскай вобласці і абласной газеты. Ад супрацоўніка музея Наталлі Валынец хлопцы і дзяўчаты даведаліся, што на Гродзеншчыне лёс Хатыні падзялілі 312 населеных пунктаў. Маладыя людзі пазнаёміліся з цыклам публікацый, у якія ўвайшлі ўспаміны відавочцаў, аповеды гісторыкаў і краязнаўцаў, эксклюзіўныя факты, фотаздымкі, матэрыялы допытаў, выяўленыя падчас расследавання справы аб генацыдзе беларускага народа. Класны кіраўнік школьнікаў **Наталля Анашкевіч** піша, што экспазіцыя нікога не пакінула абыякавым і дапамагла юным лідчанам яшчэ раз пагартаць трагічныя старонкі нашай мінуўшчыны, каб памятаць.

20 лістапада адзначаецца Сусветны дзень правоў дзіцяці. І бібліятэкар сельскай бібліятэкі аграгарадка Мураваная Ашмянка **Таццяна Ціхановіч** нагадала маленькім наведвальнікам іх правы і абавязкі, а таксама пазнаёміла з асноўнымі нарматыўнымі прававымі дакументамі: Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам Рэспублікі Беларусь “Аб правах дзіцяці”, Канвенцыяй аб правах дзіцяці.

Як паведаміла **Вольга Заянчкоўская**, бібліятэкар Астравецкай раённай бібліятэкі, у рэгіёне прайшлі мерапрыемствы да Міжнароднага дня адмовы ад курэння (21 лістапада). У **Рытанскай сельскай бібліятэцы** школьнікам нагадалі “Аб шкодзе курэння”, у філіяле “Дзіцячая бібліятэка” — што “Курыць не модна!”, а ў **Мальскай сельскай бібліятэцы** — што “Курэнне шкодзіць здароўю”. У **Падольскай сельскай бібліятэцы-клубе** цэлы тыдзень заклікалі сказаць “не” шкодным звычкам, а ў **Міхалішкаўскай сельскай бібліятэцы** высвятлялі, куды трапляюць “Знесеныя дымам”.

ПРА ДУШУ І ДЛЯ ДУШЫ

Напярэдадні зімовых свят, піша загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Лідскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы **Дар’я Марцінкевіч**, у краі традыцыйна праходзіць вялікі грамадска-царкоўны форум — Епархіяльныя Калядныя чытанні. У рамках падзеі працуюць секцыі, адна з якіх — “Дзейнасць свецкіх і царкоўна-прыходскіх бібліятэк у праваслаўных традыцыях” — была арганізаваная ў Лідскім каледжы Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Сярод удзельнікаў — спецыялісты Лідскай раённай бібліятэкі, царкоўна-прыходскіх бібліятэк, святары Лідскай епархіі, выкладчыкі і навучэнцы каледжа, супрацоўнікі ўстаноў аховы здароўя раённага цэнтра. Прысутныя абмеркавалі глабальныя праблемы і выклікі сучаснасці і духоўны выбар чалавека ў імкненні прыносіць карысць роднаму краю.

Бібліятэкар сельскай бібліятэкі аграгарадка Баруны **Наталля Рукевіч** падзялілася, што ў межах літаратурнага марафону “Пазнай Беларусь з Купалам і Коласам”, які адбываецца на Ашмяншчыне, у гэтай установе культуры адбыўся вечар “Як сэрца народа — неўміручы наш Колас”. Прысутныя ўдзельнічалі ў віктарыне па спадчыне песняра, чыталі вершы (цікавай аказалася інсцэніроўка твора “Доля батрачкі”), настаўнікі дзіцячай школы мастацтваў выканалі музычную кампазицыю “Мой родны кут”.

У Зэльвенскай раённай бібліятэцы зладзілі творчую сустрэчу з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Валянцінам Семянякам “Нам трэба некалі вяртацца...”. Як паведаміла **Вольга Камякевіч**, намеснік дырэктара бібліятэкі, на вечарыне гучалі лірычныя, філасофскія, гумарыстычныя вершы літаратара і песні на яго словы ў выкананні ўдзельнікаў эстраднай студыі “Рэтра”, у тым ліку дзве новыя — “На тых сцяжынах” і “Мая князёўна Зэльва”. Музыку да іх напісаў кампазітар Леанід Шурман.

Адрас нашай электроннай пошты: **kim@kultura-info.by**. Дзяліцеся падзеямі, што праходзяць у вашым краі.

Вера НІКАЛАЕВА

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 48 / 26 ЛІСТАПАДА 2022 г.

Даляцела!

Людміла Бусел,
бібліятэкар, блогер, пошукавік, рэканструктар:
“Люблю чытаць па-беларуску, пры нагодзе — гаварыць. Я вельмі рада, што «Птушка шчасця» нарэшце прыляцела да мяне. Няхай і з другой спробы”.

Людміла Бусел, бібліятэкар Дуброўскай сельскай бібліятэкі, што на Светлагоршчыне Гомельскай вобласці, — асоба ўнікальная. Рэдка камусьці ўдаецца за адзін месяц тройчы патрапіць на старонкі нашага выдання.

Але Людміла Фёдараўна гэтага заслужыла. Сёння ўшаноўваем яе з нагоды перамогі ў конкурсе “Крыжаванка”: птушка-абярэг, упэўнены, прынясе чытачы поспех — асабліва на прафесійнай ніве, дзе ў Людмілы шмат спраў.

“Я сумленна адказала на больш чым паўсотню пытанняў па мінулых нумарах «Культуры». Рашэнне сваёй першай крыжаванкі адправіць спазнілася. З наступнай усіх абагнала, бо два выхадныя дні, шукаючы разгадкі, гартала газеты разам з унучкай Ульянай, якая ходзіць у другі клас. Там жа не прафесійныя пытанні, а па папярэдніх нумарах «Культуры». І інтэрнэт не памочнік!

Наогул, рубрыка «Крыжаванка» вельмі карысная. Адказваючы на пытанні, я дазналася багата патрэбнай і цікавай інфармацыі, якую раней прамінула. Напрыклад, ці шмат хто ведае, што падарыў урад БССР Якубу Коласу на 60-годдзе? А сялянам якой вёскі Пясняр даслаў пісьмо? Гэтыя звесткі я ўжо выкарыстала падчас арганізацыі мерапрыемства да 140-годдзя беларускага класіка”, — падкрэсліла Людміла Фёдараўна.

Цімафей КАРПІНЧЫК

Фота запоўненай крыжаванкі дасылайце на **reklama@kultura-info.by** да **17 снежня**. Імёны пераможцы, а таксама ўладальніка суперпрыза, як мы і абяцалі, будуць апублікаваныя ў № 52 “Культуры” ад 24 снежня.

Па гарызанталі:

2. Ганаровае званне асобы, адзначанай спецыяльнай дзяржаўнай або міжнароднай прэміяй за выдатныя заслугі, дасягненні ў якой-небудзь галіне.
3. Брэсцкі ваенна-гістарычны клуб.
7. Дырэктар Палаца Рэспублікі, узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.
11. Філіп Аўрэол Тэафраст Бамбаст фон Гогенгайм. Знакаміты сярэднявечны лекар-рэвалюцыянер, імя якога на пачатку 1990-х гадоў увайшло ў кожны дом, дзе быў тэлевізар або кніжная шафа.
12. Від нарады, на якой службовыя асобы сумесна абмяркоўваюць тое ці іншае пытанне. Таксама бывае выязной. Напрыклад, апошняя такая прайшла ў Міністэрстве культуры ў кастрычніку на Гродзеншчыне і Брэстчыне.
13. Мястэчка ў Віленскай губерні (цяпер Маладзечанскі раён), дзе нарадзіўся савецкі жывапісец Раман Семашкевіч.
15. Клуб, што дзейнічае пры Лідскай гарадской бібліятэцы № 1.
20. Адна з намінацый на VIII Рэспубліканскім фестывалі нацыянальнай драматургіі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.
21. Прозвішча рэдактара інтэрнэт-рэсурсу kultura-info.by.
24. Опера Джакама Пучыні ў трох дзеях з рэпертуару Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета.
25. Мінская пошукавая група, якая разам з іншымі знаходзіць астанкі і вяртае імёны палеглых у гады Вялікай Айчыннай вайны.
26. Рухавік гандлю. Адсутнасць маркетынгавых мерапрыемстваў такога кшталту стала адной з праблем “Лістапада”.
27. Горад на Брэстчыне, дзе нядаўна знік твор манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.
30. Прозвішча ўладальніка прыза ў намінацыі “За найлепшую работу дарослага акцёра” на “Лістападзіку-2022”.
35. Назва адной з кніг беларускага першадрукара Францыска Скарыны, што выйшла ў свет у 1525 годзе.
36. Спецыяліст у навукова-даследчых інстытутах, музеях, мастацкіх галерэях…
37. Адзін з фільмаў-удзельнікаў сёлетняга “Лістапада”, зняты па матывах аповесці Чынгіза Айтматава “Белы параход”.
39. Новая спецыяльнасць у Мінскім дзяржаўным мастацкім каледжы імя А. К. Глебава, якая б’е рэкорды па конкурсе.
40. Прозвішча артыста, які сыграў маладога Песняра ў фільме “Якуб Колас. Каханне жыве для дваіх…”.
41. Узоры фальклорны калектыў Палаца культуры г. Барані Віцебскай вобласці.
46. Гісторыя гэтага спектакля была апублікавана на старонках нашага выдання ў мінулыя гады. Да яе звярнуліся сёлета ў кастрычніку на навукова-практычнай канферэнцыі ў Нясвіжы.
48. Назва суполкі, удзельнікам якой з'яўляўся графік і скульптар беларускага паходжання Раман Семашкевіч.

Па вертыкалі:

1. Народны моладзевы тэатр з Цэнтра культуры г. Віцебска.
4. Опера Джузэпэ Вердзі ў трох дзеях, прэм'ера якой адбылася ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь у 2016 годзе. Пастаноўка дагэтуль ёсць у афішы ўстановы.
5. “Мастацтва” — часопіс, а “Культура” — …
6. Пад эгідай гэтага творчага абяднання ў 1971 годзе на кінастудыі “Беларусьфільм” знялі першую ў краіне анімацыйна-лялечную стужку “Нязнайка-паэт”.
8. Беларускі і польскі паэт, гуманіст, асветнік эпохі Адраджэння.
9. Прафесія аднаго з рэспандэнтаў газеты, які наведаў мінскі кінафорум і даў каментарый у апытанцы “Культуры”.
10. Частка назвы матэрыялу пра Нясвіж. Публікацыю абралі найлепшай у выпуску № 44 ад 29 кастрычніка.
14. Выстава “3/4” выпускнікоў Мінскага дзяржаўнага каледжа імя А. К. Глебава — гэта…
16. Назва карціны Каруся Каганца.
17. Рамантычны балет у трох дзеях па рамане Віктора Гюго “Сабор Парыжскай Богамаці” з рэпертуару Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета.
18. Народная артыстка Беларусі, якая пахваліла творчасць спявачкі Святланы Данілюк, народнай артысткі СССР.
19. Народны калектыў Квасоўскага цэнтра культуры Бераставіцкага раёна.
22. Вядомы расійскі акцёр, старшыня журы асноўнай секцыі ігравога кіно “Лістапада”.
23. Тэхніка стварэння малюнкаў і дэкарыравання паверхняў. Таксама гэта карціна ці кампазіцыя, якая складаецца з дробных дэталей любога матэрыялу.
28. Антон Шапіленка і Ягор Булаўцоў — студэнты 4 курса Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, героі рубрыкі “Максіма маладых” — па родзе дзейнасці.
29. Займальны працэс знаёмства з культурай і звычаямі карэнных народаў, што пражываюць на вызначанай тэрыторыі. Такое мерапрыемства пад назвай “Па ручніку, што з роднай хаты, мы пазнаём сваю Радзіму” прайшло ў навагрудскай бібліятэцы.
30. Прозвішча кандыдата гістарычных навук, дацэнта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай, які 28 кастрычніка паўдзельнічаў у навукова-практычнай канферэнцыі ў Нясвіжы.
31. Адна з пастановак Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча, заснаваная на біяграфіі класіка.
32. Падвесны фігурны падсвечнік, адзін з якіх быў зроблены кавалём Паўлам Багрымам у 1881 годзе.
33. Опера, што ў межах праекта TheatreHD у лістападзе паказалі ў дзвюх мінскіх кіназалах. У пастаноўцы музычнага твора ўдзельнічаў беларускі спявак Павел Пятроў.
34. Скульптар, мастак і графік беларускага паходжання, аўтар выбітных помнікаў у буйных гарадах Расіі.
35. Стыхія, якая не любіць жартаваць. Яна стала прадметам рубрыкі “Гарачая тэма”.
38. Фальклорны гурт аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры Лідскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці.
42. Гэтую сельскагаспадарчую культуру называюць не толькі паўночным шоўкам, але і золатам Беларусі.
43. Месца нараджэння дырыжора, мастацкага кіраўніка аркестра рускіх народных інструментаў Мінскага дзяржаўнага каледжа імя М. Глінкі.
44. Назва карціны Рамана Семашкевіча, натурршчыдай для якой стала яго жонка Надзея Васільева.
45. Раённы цэнтр у Брэсцкай вобласці, дзе ў кастрычніку праходзіла выязное пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры.
47. Краіна-ўдзельніца “Лістапада-2022”.

Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 44 ад 29.10.2022.

Па гарызанталі: 3. Белгазпрамбанк. 4. Лістападзік. 6. Вераснянка. 7. Філімонава. 9. Сёстры. 10. Матусевіч. 12. Лес. 13. Палац. 15. Таджыкістан. 17. Дубатоўк. 19. Партсігар. 20. Стратэгія. 21. Пятрушка. 24. Іран. 27. Жылічы. 29. Брама. 30. Міжрэчча. 31. Надзённае. 32. Анімаёўка. 33. Кантроль. 34. Смалявуд. 35. Капрызка. 36. Зернавушка. 38. Графіка. 41. Сямнаццаць. 43. Какошчыцы.

Па вертыкалі: 1. Фартэпіяна. 2. Маладзечна. 5. Кастрычнік. 8. Выкрунтасы. 11. Карповіч. 12. Лапіцкі. 14. Ведамасны. 16. Сябры. 18. Лазоўская. 22. Ратуша. 23. Светач. 25. Дугін. 26. Капліца. 27. Жызэль. 28. Гуандун. 29. Бастынь. 30. Мінейка. 32. Арытмія. 35. Калуга. 37. Федарэнка. 39. Нядзельнік. 40. Ажэшка. 41. Спадчына. 42. Таночак.

Ёсць чым пахваліцца між сабой і ў свеце

Якія звычаі і традыцыі захоўваюць у розных кутках Беларусі?

У рамках Міжнароднага навукова-практычнага семінара "Захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны краін СНД у кантэксце глабальных выклікаў" з 12 па 20 лістапада ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага праходзіла выстава "Нематэрыяльная культурная спадчына Беларусі". Агульнарэспубліканскую экспазіцыю такога маштабу, якая ахоплівае здабыткі ўсіх рэгіёнаў, прадэманстравалі ў нашай краіне ўпершыню.

Падчас урачыстай прэзентацыі 17 лістапада з выставай азнаёміліся ўдзельнікі семінара, якія прыехалі ў Беларусь з Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Расійскай Федэрацыі, Таджыкістана, Туркменістана і Узбекістана. Носьбіты традыцый, народныя калектывы і майстры распавядалі пра рамёствы, звычаі дзяды, уласцівыя іх мясцовасцям. Перад пачаткам агляду гасцей павітала і пачаставала сваімі смачнымі вырабамі слонімская аматарскае аб'яднанне "Чараўніцы-каравайніцы".

КОЖНЫ НА СВОЙ ЛАД

Прастора экспазіцыі была ўмоўна падзеленая на шэсць зон, кожную з якіх прысвяцілі нематэрыяльнай культурнай спадчыне адной з абласцей Беларусі. Акрамя таго, на выставе паказалі калекцыю традыцыйнага касцюма розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў краіны з фондаў Музея старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук, а таксама сцэнічныя строі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы да спектакля "Паўлінка", які летась атрымаў статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Брэсцкая вобласць на выставе прадэманстравала ўзоры маларыцкага і кобрынскага традыцыйнага строяў, калекцыю шчэпавых птушак, якіх ствараюць разьбяры Бярозаўскага раёна, вырабаў з саломы, а таксама інсітныя драўляныя скульптуры народных майстроў Мікалая Тарасюка і Івана Супрунчыка. Тут жа можна было даведацца больш пра вясновы абрадавы карагод "Стрылка" ў вёсцы Бездзеж Драгічынскага раёна, традыцыю карагодаў на Вяліздзень, Праводную нядзелю і "Провады зімы", якая захоўваецца ў вёсцы Пінкавічы Пінскага раёна, пра абрад "Намскі Вялікдзень", што ладзіцца ў вёсцы Аброва Іваўсэвіцкага раёна, ды традыцыю "Ваджэнне кусты", уласцівую вёсцы Лобча на Лунінеччыне, а яшчэ пра местачковы калядны карнавал "Конікі" ў Давыд-Гарадку Столінскага раёна і адметныя традыцыі памінання продкаў у вёсцы Раздзялавічы Ганцавіцкага раёна. Быў прадэманстраваны і адмысловы строй свахі, традыцыі вырабу якога аберагаюць у вёсках Лелікава і Павіцце Кобрынскага раёна. Акрамя таго, госці з Брэстчыны пазнаёмілі наведвальнікаў выставы са звычаямі выпякання грачанага хлеба ў Маларыцкім раёне і сакрэтамі прыгатавання рыбы, сушанай у печы на саломе, у Бярозаўскім раёне, з побытавым танцам "Спораўская полька".

Віцебская вобласць прэзентавала свае візітоўкі — паазерскія маляваныя дываны, ажурнае ткацтва Гарадоцкага раёна, спіральнае пляценне, ткацтва ў тэхніцы аднабаковага перабору, выцінанку і мастацкія практыкі саломапляцення. Можна было пабачыць і калядную батлейку "Віцебскі жлоб", адноўленую кіраўніком наваполацкага народнага тэатра лялек "КапялюШ" Андрэем Рэцікавым.

Гомельская вобласць была прадстаўленая мноствам архаічных абрадаў, якія захаваліся з даўніх часоў. Гэта "Юр'я" з вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна, "Ваджэнне і пахаванне стралы" з вёскі Казацкія Балсуны на Веткаўшчыне, "Провады русалкі" з Хойніччыны, "Ваджэнне Сулы" з Гомельскага, "Чырачка" і "Каменныя дзеваўкі" з Лельчыцкага раёнаў. Да таго ж госці з усходу Палесся прадэманстравалі традыцыі ляснога бортніцтва і вырабу прыпяцкіх чаўноў у вёсцы Перароў Жыткавіцкага раёна.

Калі гаварыць пра адметныя звычаі Гродзенскай вобласці, на выставе можна было дазнацца пра белаўзорыстае ткацтва Панямоння і каляровыя посцілкі ды дываны, велікодныя традыцыі роспісу яек і вырабу вербаў, пазнаёміцца з сакрэтамі выпечкі вясельнага каравая і поразаўскіх слоек, з рэцэптамі бульбяных страў. Акрамя таго, прапаноўвалі агледзець габелены, выкананыя ў тэхніцы падвойнага ткацтва майстрыхай Аленай Шунейка, з выяўленымі на іх помнікамі архітэктуры Гродзеншчыны. Былі ў экспазіцыі і творы Мар'яна Скрамблевіча — народнага майстра па вырабе музычных інструментаў з Адэльска Гродзенскага раёна. А майстрыха Наталля Клімко з Навагрудскага раёна ладзіла майстар-клас па выбіванцы. Гэта своеасаблівы аналаг выцінанкі, толькі ўзор робіцца малаточкам і долатам.

Магілёўская вобласць прадставіла калекцыю гліняных прадметаў, выцінанак, а яшчэ — драўляных музычных інструментаў, выкананых майстрам Аляксандрам Харкевічам з вёскі Валканосава Круглянскага раёна, саламяных павукоў, якіх ствараюць на Быхаўшчыне. Былі даступныя і звесткі пра майстэрства дрыбінскіх шапавалаў, абрады "Бразгун" з вёскі Норкі Чэрыкаўскага раёна, "Куры" з Клічаўскага раёна і "Варвараўская свяча" з вёскі Басценавічы Мсціслаўскага раёна. А дырэктар Дома рамёстваў аграгарадка Кароўчына на Дрыбіншчыне Таццяна Сіроціна правяла майстар-клас па пляценні лапцей.

Мінская вобласць пазнаёміла са звычаямі "Калядныя цары" і "Цягнуць Каляду на дуба", з традыцыяй ушанавання іконы Маці Божай Будслаўскай, сакрэтамі выпякання хлеба з вёсак Жораўка і Кузьмічы на Любаншчыне, а таксама з выцінанкамі і ручнікамі ў тэхніцы закладнога ткацтва. Наведвальнікі прэзентацыі маглі даведацца пра першых выканаўцаў роляў "калядных цароў" з Семежава Капыльскага раёна, якія ўдзельнічалі ў абрадзе ў часы яго аднаўлення ў 1996 годзе — а ўжо ў 2009-м звычай быў уключаны UNESCO ў Спіс спадчыны, якой патрабуецца тэрміновая ахова.

АДНЫ З ПЕРШЫХ

Нематэрыяльная культурная спадчына ўяўляе сабой сукупнасць традыцый, абрадаў, ведаў, навыкаў і практык, а таксама звязаных з імі атрыбутаў і інструментаў. Яна перадаецца ад пакалення да пакалення і фарміруе ў народа пачуццё самабытнасці, забяспечвае пераемнасць. Беларусь ратыфікавала Канвенцыю абахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны яшчэ ў 2006 годзе ў ліку першых дзесяці краін. Сёння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей уключаныя сто шэсцьдзясят чатыры элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, сярод якіх — практыкі народных рамёстваў, абрады і святы, традыцыі кухні, выканальніцкіх мастацтваў, вусныя звычаі.

Чатыры элементы ўключаныя і ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO. Гэта Будслаўскі фэст у Мядзельскім раёне, які ладзіцца, каб ушанаваць мясцовую цудадзейную ікону Божай Маці, абрад "Калядныя цары" з вёскі Семежава Капыльскага, "Юр'еўскі карагод" з вёскі Пагост Жыткавіцкага раёнаў, а таксама лясное бортніцтва. Найбліжэйшым часам на 17-й сесіі Міжурадавага камітэта па ахове нематэрыяльнай спадчыны UNESCO павінны разглядзець яшчэ адну заяўку ад нашай краіны на ўключэнне ў Спіс сусветнай культурнай спадчыны — традыцыі саломапляцення. Выстава "Нематэрыяльная культурная спадчына Беларусі" яшчэ раз пераканаўча паказала, што ў кожным кутку Сінявокай захаваліся адметныя звычаі, а ўсім нам ёсць чым пахваліцца і на міжнародным арэне.

Антон Рудак

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Майстар-клас Наталлі Клімко

Падчас агляду экспазіцыі

Унутры бібліобуса Іўеўскай раённай бібліятэкі

Сучасны бібліобус

Звычайная машына ці спецыялізаваны аўтамабіль?

Сёння з улікам аптымізацыі сеткі бібліятэчных устаноў нашай краіны мабільныя кніжніцы робяцца ўсё больш і больш запатрабаванымі. Але пытанне ў тым, ці паспяваюць бібліобусы за часам, які так імкліва змяняецца? У праблеме паспрабавала разабрацца "К".

АЎТАБІБЛІЯТЭКА ЁСЦЬ ЦІ ЯЕ НЯМА?

Напрыклад, па словах галоўнага спецыяліста ўпраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Беларусі Алены Бераазоўскай, нават самыя аддаленыя населеныя пункты краіны цяпер не застаюцца без увагі бібліятэкараў.

— Сёння кнігі жыхарам аддаленых вёсак дастаўляюць 106 бібліобусаў — так званых міні-бібліятэк на колах, — адзначае Алена Бераазоўская. — Да таго ж у мэтах удасканалення бібліятэчнай справы летам бягучага года быў створаны Рэспубліканскі бібліятэчны савет пры Міністэрстве культуры Беларусі — у яго склад увайшлі дырэктары абласных бібліятэк, кіраўнікі вядучых бібліятэк ВНУ краіны і некаторыя іншыя.

Але ўзнікае праблема: калі бібліобусаў у краіне 106, значыць, у 12 з 118 раёнаў Беларусі яны з той ці іншай прычыны адсутнічаюць. Напрыклад, падобная сітуацыя склалася ў **Барысаўскім раёне** Мінскай вобласці.

— Так, на сёння ў нас аўтабібліятэкі няма, — пацвердзіла дырэктар Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Івана Каладзеева Алена Капыток. — Наш бібліобус быў вельмі стары, таму цяпер проста спісаны. Вядома, вельмі чакаем новага аўтамабіля і спадзяёмся, што хутка мы яго атрымаем.

З далейшых адказаў Алены Сяргееўны высветлілася, што аўтабібліятэка ў іх была прыстасаваная — на выездах выкарыстоўвалася фактычна звычайная машына, дзе на сядзеннях (ці пад імі) складаліся стосы часопісаў ды скрынкі з кнігамі. Адсюль — наступнае пытанне: новая машына павінна быць такой жа самай ці ўсё ж спецыялізаванай, зробленай менавіта для бібліятэчных патрэб?

— Канешне, нам хацелася б атрымаць мабільную бібліятэку ўжо абсталяванай стэлажамі для кніг і часопісаў, з месцам для бібліятэкара, — адзначыла Алена Капыток. — Бо, як кажуць, кепскі той салдат, які не марыць стаць генералам.

СТАРАСЦЬ І МАШЫНАМ НЕ Ў РАДАСЦЬ

Што ж, натуральна, мабільныя бібліятэкі, асабліва ў нашы часы, калі запуск касмічных караблёў зрабіўся завядзёнкай, а чалавецтва марыць пра падарожжы на Марс, павінны быць абсталяваны згодна з пажаданнямі бібліятэкараў. Іншая справа, што не заўсёды так бывае. І часцей аўтабібліятэка сёння — гэта звычайная "ГАЗель" ці ў найлепшым выпадку "пежо", на сядзеннях якога ляжаць стосы з кнігамі. На свае вочы бачыў такія.

Напрыклад, падобная мабільная бібліятэка працуе ў **Гарадоцкім раёне** Віцебскай вобласці. Як расказала дырэктар Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі Ада Абрамава, машына, якая выязджае з кнігамі да сяльчан, даволі старая і нядаўна тры месяцы была на рамонце.

— Яна ў нас ужо 16 гадоў і, зразумела, патрабуе абнаўлення, — кажа Ада Абрамава. — Так, кнігі ў ёй мы размяшчаем на сядзеннях, у скрынках. Пра прыстасаваную для бібліятэкараў машыну мы пакуль што толькі марым. У 2023 годзе ў Гарадку запланавана правядзенне Дня беларускага пісьменства, і мы вельмі спадзяёмся, што да гэтай даты нам знойдуць новы аўтамабіль. Балазе з кожным годам павялічваецца колькасць населеных пунктаў, якія мы абслугоўваем, бо бібліятэкі ў сельскай мясцовасці паступова закрываюцца.

Падобная сітуацыя — і ў **Бярозаўскай** раённай бібліятэчнай сістэме, што на Брэстчыне. Як кажа дырэктар Бярозаўскай РЦБС Ірына Макарэвіч, аўтабібліятэка працуе ў раёне з 2008 года, выязджае цягам месяца ў 36 населеных пунктаў і, натуральна, знасілася.

— Новую машыну мы чакаем у наступным годзе — заяўка на яе набыццё ўжо пададзеная, — кажа Ірына Макарэвіч. — Але будзе яна спецыялізаваная ці звычайная — пакуль невядома.

Ды і ў гарадскім пасёлку **Акцябрскі**, што на Гомельшчыне, сітуацыя тая ж. Па словах дырэктара Акцябрскай ЦРБ Святланы Шэйка, аўтабібліятэка працуе ў раёне з 2008 года і патрабуе замены.

— У 2023-м у Акцябрскім плануецца правядзенне абласных "Дажынак", магчыма, пад гэтае свята атрымаецца займець і новы аўтамабіль, — кажа Святлана Шэйка. — Бо, як і ў горадзе, у сяле жыве шмат людзей сталага ўзросту, для якіх чытанне застаецца важнай і паўсядзённай справай. Таму мы пастаянна ўлічваем пажаданні чытачоў, абнаўляем літаратуру ў аўтабібліятэцы, прывозім кнігі пад заказ, з тым ліку і новыя выданні ды часопісы.

А вось у **Салігорску** Мінскай вобласці нядаўна з'явілася новая, хоць і не спецыялізаваная, машына пад аўтабібліятэку. Адбылося гэта дзякуючы спонсарам. Праўда, каб іх адшукаць, дырэктару Салігорскай кніжніцы давялося абысці не адно гарадское прадпрыемства.

— Летась да 60-гадовага юбілею раённай цэнтральнай бібліятэкі ААТ "Навукова-вытворчае аб'яднанне «Пасат»" падарыла нам новы аўтамабіль, — распавядае дырэктар Салігорскай РЦБ Людміла Муравейка. — Таксама ў якасці спонсарскай дапамогі былі зроблены рэкламна-інфармацыйныя выявы на знешніх бартах падараванага бібліобуса. Яго фонд складаецца з галіновай і мастацкай літаратуры, перыядычных выданняў. Пры фарміраванні фонду ўлічваецца ўзроставы склад жыхароў, іх зацікаўленасці, прымаюцца папярэднія заказы на літаратуру і перыёдыку. Абслугоўванне маланаселеных пунктаў вядзецца згодна з 12 распрацаванымі маршрутамі, а гэта 68 вёсак. Так што наш бібліобус заўсёды пры справе.

НОВЫ ПАДЫХОД ДА МАБІЛЬНАСЦІ

Натуральна, ёсць і станоўчыя прыклады, дзе ў раёне дзейнічае спецыялізаваная аўтабібліятэка, прыстасаваная менавіта для перавозкі кніг. Там чытачы могуць не толькі пагартаць літаратурныя навінкі, але і скарыстацца іншымі сучаснымі паслугамі. Так, яшчэ летась **Іўеўская** раённая бібліятэка, што на Гродзеншчыне, атрымала новы бібліобус.

— Гэта сапраўдны бібліятэчны мабільны інфармацыйны комплекс! — радуецца дырэктар Іўеўскай раённай бібліятэкі Святлана Мірончык. — Маем у бібліобусе прадуманую сістэму стэлажоў і кніжных шаф для экспанавання і дастаўкі літаратуры. Таксама ў салоне прадугледжаны пасадачныя месцы для чытачоў і бібліятэкара, у якога ёсць ноўтбук, прынтар, сканер, ксеракс. Абслугоўваем 38 вёсак, і ўсюды нам вельмі ўдзячныя, тым больш што наша аўтабібліятэка прыгожа афармленая звонку і заўсёды прыцягвае ўвагу жыхароў вёсак.

Абноўленую спецыялізаваную машыну не так даўно атрымалі і бібліятэкары Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

— У яе ўбудаваныя стэлажы для кніг і часопісаў, ёсць столік для бібліятэкара, ноўтбук, праведзеная электрычнасць, — кажа намеснік дырэктара Баранавіцкай РЦБС Вольга Міроненка. — Нас чакаюць, замаўляюць у нас патрэбную літаратуру і праз інтэрнэт, і па тэлефоне, таму падобныя мабільныя бібліятэкі ў раёне вельмі запатрабаваны.

Зразумела, няма межаў для дасканаласці, і таму кіраўнікі бібліятэк, нават маючы падобныя спецыялізаваныя і прыстасаваныя аўтамабілі, усё адно знойдуць дэталі, якія можна палепшыць. Скажам, Святлана Мірончык адзначыла, што добра было б, каб новая аўтабібліятэка стала вышэйшай, каб у ёй мог выпрастацца чалавек, які разглядае кнігі. А яшчэ някепска б зрабіць паліцы для кніг вузейшымі — няхай бы ўнутры было больш месца. Вольга Міроненка, у сваю чаргу, распавяла пра тое, што адна іх аўтабібліятэка абслугоўвае прыкладна 90 вёсак, а гэта — 15 розных маршрутаў. Таму, магчыма, варта падумаць і пра другую аўтабібліятэку, якая б таксама развозіла літаратуру па Баранавіцкім раёне.

У ЯКАСЦІ ЗАКЛЮЧЭННЯ

Беларускі шлях да ўкаранення бібліобусаў на сяле — практыка, распачатая яшчэ за савецкім часам адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны, — сябе цалкам апраўдвае. Іншая справа, што даўно варта было б паклапаціцца пра распрацоўку і выпуск спецыялізаваных аўтамабіляў, прыстасаваных пад патрэбы бібліятэкараў. Прычым не проста "бусікаў", дзе на сядзеннях ці пад імі размяшчаецца літаратура, а сапраўдных спецыялізаваных аўтобусаў (ці міні-бусаў), абсталяваных усім неабходным.

Скажам, акрамя кніг, у тым ліку электроннага фармату, у падобнай аўтабібліятэцы любы сельскі жыхар мог бы пакарыстацца камп'ютарам з інтэрнэтам, раздрукаваць неабходны матэрыял на прынтары, замовіць тую ці іншую кнігу ў электронным каталогу і гэтак далей. І, як бачна на прыкладзе бібліятэчных сістэм Баранавічаў і Іўя, паступова ў Беларусі ўсё да гэтага і ідзе, хоць, можа, і не так хутка, як патрабуе час. Што ні кажы, а працэс аптымізацыі бібліятэчных устаноў у краіне будзе працягвацца. Таму за падобнымі сучаснымі спецыялізаванымі "бібліятэкамі на колах", несумненна, вялікая будучыня і рэальныя перспектывы.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Падчас працы бібліобуса Салігорскай раённай бібліятэкі

Так выглядае новы бібліобус Іўеўскай раённай бібліятэкі

Спазнаць край праз рэйкі

Арцём Слізкі

Вузкакалейныя чыгункі, якімі некалі была ахутана ці не ўся беларуская зямля, сёння сталі дзівам-рарытэтам. Рэйкі ды тэхніка ідуць у металалом, а разам з тым на сметнік адпраўляецца цэлы пласт нашай гісторыі. Зберагчы яго імкнецца мінчук Арцём Слізкі — ён стварае адзіны ў Беларусі музей вузкакалейнай чыгункі.

На тэрыторыі Беларусі вузкакалейныя чыгункі пачалі будаваць напрыканцы XIX стагоддзя. У розныя часы яны па-свойму служылі людзям: падчас Першай сусветнай вайны — як шляхі забеспячэння фронту, пазней такія дарогі пракладвалі для дастаўкі лесу і торфу. Выкарыстоўвалі вузкакалейкі і для пасажырскіх перавозак. Напрыклад, так званая "курортная" дарога паміж Лынтупамі і Кабыльнікам у Нарачанскім краі ў 1920-я была запатрабаванай у турыстаў.

Разам з рупліўцам "К" выправілася ў аграгарадок Дзітва пад Лідай. Менавіта там на мясцовым торфабрыкетным заводзе неўзабаве разгорнецца комплекс, які выйдзе за рамкі класічнага музея: старыя экспанаты размесцяць на тэрыторыі дзейнага транспартнага цэха з разнастайнай тэхнікай, чыгуначным пуцём на тры дзясяткі кіламетраў, станцыяй і дэпо. Таму наведвальнікі не толькі даведаюцца пра гісторыю вузкакалейкі, але і ўбачаць дарогу "ў справе".

Да станцыі мы прыехалі якраз перад адпраўленнем цеплавоза з пасажырскім вагонам. Звычайна ён дастаўляе работнікаў да торфанарыхтовак, але часам месцы займаюць экскурсанты, гэтым разам — гродзенскія школьнікі. Далучаемся да шумнай дзіцячай кампаніі і адпраўляемся на агледзіны.

Гудок, састаў кранаецца — і неўзабаве віды заводскай тэрыторыі за вокнамі змяняюцца маляўнічымі далягледамі. То бясконцае ворыва, то змешаны лес і бярэзнічак, то зноў абшары зямлі са старымі самотнымі хутарамі. Нарэшце цягнік выпаўзае на бясконцыя чорныя палі, на якіх зяюць аранжавыя машыны для здабычы торфу. Па дарозе спыняемся на раз'ездзе, каб прапусціць сустрэчны грузавы састаў. Праз нейкі час перамяшчаемся паўз вялізныя разлівы — паўторна затопленыя распрацоўкі. На іх ужо скончылі здабычу пароды, і цяпер гэта сапраўдны рай для вадаплаўных птушак і ўлюбёнае месца для промыслу рыбакоў з усіх ваколіц. Едзем павольна — цягнік набірае хуткасць, не большую чым 25 кіламетраў за гадзіну, таму часу палюбавацца краявідамі і зрабіць фота на памяць дастаткова. І нашы маленькія спадарожнікі не прапускаюць такую магчымасць.

БЕЗ ХІТРАГА РАЗЛІКУ

Можа падацца парадоксам, але праз сваю дагледжанасць дзітвянская дарога не адразу прывабіла Арцёма Слізкага як пляцоўка для музейнага комплексу. Адмысловец жартуе, што яго першай любоўю была вузкакалейка на торфапрадпрыемстве пад Рудзенскам: тры веткі з перагрузачнай станцыяй на шырокую каляіну, мноства тэхнікі і неапісальнай прыгажосці прырода. Шлях, абсыпаны па баках ледавіковымі валунамі, цягнуўся праз палі і цёмныя лясы, выходзіў да амаль некранутага балота. На жаль, у гэтых цудоўных мясцінах уладкавацца не атрымалася, як і знайсці агульную мову з уладальнікамі некаторых іншых вузкакалеек. А вось у Дзітве, дзе Арцём ладзіць экскурсіі з 2017 года, праявілі гасціннасць. І кіраўніцтва завода, і супрацоўнікі паставіліся да ініцыятывы з цікавасцю. "Колькі можна бегаць, калі ёсць месца, дзе нас прымаюць і падтрымліваюць", — падумаў Арцём і вырашыў не адмаўляцца ад шансу нарэшце закласці падмуркі музея.

У кабінетах жа, па якіх давялося пабегаць з прапановамі, верагодна, разглядалі ініцыятыву як спробу нажыцца, ды толькі на гэтай справе абагаціцца амаль немагчыма. Пакуль на пакупку, транспарціроўку і рэстаўрацыю экспанатаў Арцём выдаткоўвае ўласную зарплату, а таксама грошы ад экскурсій і ахвяраванні. Ці гэта не доказ, што чалавекам кіруе не жаданне атрымаць выгаду, а шчырая апантанасць справай?

ПАЧАТАК КАЛЕКЦЫІ

Хоць вялікага бюджэту некамерцыйная ўстанова "Нязведаная вузкакалейка" не мае, ужо ўдалося набыць колькі рарытэтаў для музея. На стаянцы бачым першы экспанат — крыты грузавы вагон 1968 года вытворчасці, які даставілі ў Дзітву год таму ў даволі сумным стане. Спярша яго нават не здолеў падняць кран, бо ўнутры ляжала дванаццаць тон акамянелага цэменту. Цяпер вагон вычышчаны, нанова абшыты і пафарбаваны. І ў будучыні ён стане выставачнай залай на колах, дзе пакажуць карты, фотаздымкі і нават відэаматэрыялы — якіх цікавінак не знойдзеш у архівах!

Яшчэ два экспанаты, датаваныя канцом 1940-х — пачаткам 1950-х, знаходзяцца ў майстэрні. Там каманда "ажыўляе" вагон нямецкай фірмы Ammendorf, які выкарыстоўвалі ў сферы лесанарыхтовак: гэтая перасоўная электрастанцыя выпрацоўвала энергію для піл. З кузава пры дапамозе мыйкі высокага ціску счысцілі бруд, старую фарбу і рыхлыя часцінкі драўніны, затым адшліфавалі паверхню. Напярэдадні яшчэ грунтоўка і афарбоўка сцен у натуральны колер, але на гэтым праца не спыніцца, бо час не пашкадаваў старыя дошкі і частку абшыўкі давядзецца ўзнавіць з нуля.

Побач на рэйках чакае свайго часу самы свежы музейны набытак — грузапасажырскі вагон нямецкай вытворчасці. Некалі ён бегаў па разгалінаванай вузкакалейцы Светлагорскай цеплаэлектрацэнтралі. Што адметна, расшукаць даволі рэдкі экзэмпляр удалося дзякуючы фільму краязнаўцаў пра гісторыю гэтай дарогі.

А колькі драбнейшых цікавінак захоўваецца ў калекцыі! Да прыкладу, рэйкі ад ваенна-палявых пераносных чыгунак. За кошт адмысловых кручкоў сабраць такую дарогу можна было без рыштунку — як канструктар. Тут жа зберагаюцца шпалы часоў Першай сусветнай вайны. Іх Арцём літаральна выдзіраў з зямлі: дбайныя гаспадары некалі расцягнулі рэшткі былых чыгунак, закапалі іх замест платоў на сваіх участках. Рэанімаваць давялося і раму ад даваеннай ваганеткі з перакульным кузавам, што некалі выкарыстоўвалі для перавозкі пяску і гліны. Мінулы ўладальнік на кляймо 1930-х гадоў, напэўна, увагі не звярнуў ды распілаваў раму на кавалкі для сваіх мэт. Але дзітвянскія зварышчыкі прывялі канструкцыю да ладу.

АЎТОБУС НА РЭЙКАХ?

Вядома, у стваральніка музея Арцёма Слізкага ёсць спіс тэхнікі, якую варта выратаваць ад разбурэння і перавезці ў экспазіцыю. Напрыклад, пад Светлагорскам захаваўся кузаў аўтаматрысы — самаходнага вагона для перавозкі пасажыраў на прыгарадных маршрутах. У дзейным стане такіх "аўтобусаў на рэйках" у нашай краіне не захавалася, таму знаходка ўяўляе велізарную каштоўнасць, а два захаваныя кузавы можна ператварыць у прыгожы прычапны вагон. Таксама хацелася б папоўніць калекцыю самаробным снегаачышчальнікам для вузкакалеек 1930-х. Усё гэта патрабуе немалых выдаткаў, а значыць, без удзелу суайчыннікаў не абысціся. Ахвяраваць грошы, паўдзельнічаць у суботніку ці даць наводку на новы артэфакт — дапамагчы можа кожны. Дык не забывайма пра нашу даўнюю традыцыю рабіць важныя справы талакою.

Даніл ШЭЙКА
Мінск — Дзітва — Мінск

Мастак Адам і паэт Юзаф,

або Дзе малая радзіма братоў Шэмешаў

Адам Шэмеш. Аўтапартрэт.

Ёсць у нашай сталіцы, адразу за Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, невялічкі, але ўтульны мікраараён Вялікая Сляпянка. Адметны ён не толькі сядзібай Ваньковіча (не блытаць з домам-музеем у цэнтры Мінска), але і вуліцамі, названымі ў гонар творцаў і навукоўцаў. Іх прозвішчы, дарэчы, гучаць амаль як той спеў: "Ваньковіча – Буйніцкага, Дамейкі – Тарашкевіча, Рушчыца і... ШЭМЕША". Пагаворым сёння пра таямніцы роду Шэмешаў, які пакінуў у гісторыі Беларусі адметны след.

ШЭМЕШЫ

Не хопіць газеты, каб даць разгорнутую характарыстыку ўсім прадстаўнікам гэтага роду, таму абмяжуемся кароткай даведкай пра бацькоў Адама і Юзафа. Казімір Шэмеш, маршалак шляхты Ігуменскага павета, быў сынам Міхала і Апалоніі Ільініч, чый маёнтак Бараціўны знаходзіўся на поўдзень ад горада Беразіно, амаль на самым беразе ракі. Меў брата Гілярыя, які жыў у Пуцьках. Сваяцтвам Шэмешы былі шчыльна звязаныя з такімі вядомымі старымі родамі, як Ваньковічы, Абуховічы, Валовічы, Бярновічы, Яленскія, Ромеры, Чаховічы, Святарэцкія... Ажаніўся Казімір з Эвелінай Вэндарф з Клеччыны. Цікавыя падрабязнасці, датычныя жывой гісторыі гэтага і сваяцкіх Шэмешам родаў, пакінула ў сваіх успамінах дачка Казіміра і Эвеліны, знакамітая пісьменніца Ефа Фелінская. Дарэчы, брат яе мужа Алойзы Фелінскі стварыў трагедыю "Барбара Радзівіл", што ў 1817 годзе з ашаламляльным поспехам была пастаўленая на тэатральнай сцэне.

АДАМ

У гісторыі беларускага мастацтва Адам Шэмеш пакінуў вельмі значны след. І не толькі як выдатны жывапісец: партрэтыст (выявы Уладзіслава Сыракомлі, Станіслава Манюшкі і жонкі кампазітара Аляксандры з сынам), ілюстратар (творы Адама Міцкевіча), майстра тэатральных дэкарацый (супрацоўніцтва з Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам), але і як мастацтвазнавец. Менавіта яго пяру належаць першы пасмяротны жыццяпіс старэйшага сябра, вядомага мінскага мастака Яна Дамеля (сканаў у 1840-м годзе, пахаваны ў касцёле на Кальварыі) і гісторыя Віленскай мастацкай школы, якія надрукаваў у альманаху Athenaeum пружанец Юзаф Крашэўскі, знакаміты пісьменнік, публіцыст і выдавец XIX стагоддзя. Заслугі Адама Шэмеша не абыдзены ўвагай беларускіх экспертаў. Сярод найлепшых публікацый — "Ключ да мастацтва, або Багатае сэрца Адама Шэмеша" выдатнага беларускага мастацтвазнаўцы Барыса Крэпака (гл. "К" №№ 32 і 33, 2011). Дзякуючы названаму матэрыялу, на ўмоўным "дрэве памяці" аўтара гэтых радкоў з'явілася яшчэ адна "прышчэпка", шэмешаўская. І вось якія плады яна дала.

Пішучы пра месца нараджэння мастака, даследчыкі бяруць даволі шырокі абсяг — Слуцкі павет (па сённяшніх мерках тэрыторыя некалькіх раёнаў). Ёсць пытанні да даты нараджэння. Давайце зазірнём у метрыку хросту Адама Станіслава Шэмеша. З'явіўся на свет **19 жніўня 1808 года** па старым стылі ў Клецкай парафіі. У метрыцы напісана Ratynka, але, пэўна, маецца на ўвазе Галынка, якая належала Вэндарфам, сваякам Адамавай маці. Хроснай стала Алена Вянгрэцкая, а хросным — князь Антон Радзівіл (!). Праўда, не Антон-Генрык, кампазітар і аўтар музыкі да оперы Ёгана Гётэ "Фаўст". Хросны Адама быў сынам троцкага ваяводы Юзафа Мікалая Радзівіла і ўнукам Марціна Мікалая Караля Радзівіла — таго самага, які займаўся навукамі і алхіміяй, займеў мянушкі "Сіняя Барада" і "беларускі Фаўст". Асістэнтамі на хросце былі ротмістр нацыянальнай кавалерыі Ігнат Вэндарф, жонка маршалка Пінскага павета Яна Арэшка і іншыя значныя асобы.

Што ж датычыцца месца і дня скону, то лічыцца, быццам Адам Шэмеш спачыў у Мінску летам 1808 года. Але метрыка сведчыць: смерць ад "кадучай хваробы" (эпілепсіі) напаткала творцу ў Вільні, у доме Ромераў (сваякоў мастака Альфрэда Ромера) на вуліцы Савіч (сёння Бокшта, 10). Здарылася гэта 3 жніўня 1808-га. А 7 жніўня Адама пахавалі на бернардзінскіх могілках, дзе раней знайшла апошні прытулак маці жывапісца. На жаль, магіла творцы не захавалася.

ЮЗАФ

У 1838 годзе ў віленскім альманаху "Бірута" з'явілася невялічкая публікацыя пад простай назвай "Юзаф Шэмеш", побач — некалькі вершаў ("Магіла маці" і два санеты). Думаецца, што аўтарам ананімнага матэрыялу стаў старэйшы брат Юзафа Адам. Бо хто, як не ён, настолькі добра ведаў пра жыццё маладога паэта, што памёр, "пачынаючы дваццаць пяты год"? Вось кароткая біяграфічная нататка, у якой мы выкарысталі звесткі ананімнага аўтара і дадалі архіўныя знаходкі (новая інфармацыя вылучаная паўтлустым).

Як і Адам, Юзаф нарадзіўся не ў Бараўчах. Ён з'явіўся на свет на Клеччыне, у Гальнцы (маёнтку сваёй маці Эвеліны Вэндарф) 7 (?) лютага 1810 года і ў той жа дзень быў ахрышчаны адной вадой Юзафам Афанасовічам, адміністратарам гальнкаўскай уніяцкай царквы (царква захавалася, але ў 1864 годзе была перабудаваная). Дапоўнілі хрост алеем 25 ліпеня 1820 года ўжо ў Бярэзінскай парафіі. Хваробы, перанесеныя Юзафам у дзяцінстве, адбіліся потым на ўсім яго лёсе, бедным на шчаслівыя выпадкі і здзяйсненні, але багатым на пачуцці. Вучыўся будучы паэт спярша ў Мінску, а з 1825-га — у Вільні. **Верагодна, перабралася туды і маці Юзафа, каб быць бліжэй да сыноў. Там яна і памерла, маючы 39 гадоў, 2 жніўня 1827 года. Пахавалі Эвеліну на знакамітых бернардзінскіх могілках у правым крыле катакомбаў (разрабаваных і знесеных у савецкі час).** У 1828-м Юзаф паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Віленскага ўніверсітэта і пачаў пісаць вершы. Але напрыканцы 1829-га вучобу прыйшлося спыніць, бо смяротна хворы бацька выклікаў сына ў Бараціўны. **5 лютага 1830 года Шэмеш-старэйшы сканаў і быў пахаваны ў сямейнай капліцы. А 1 жніўня (у метрыцы 2 жніўня) 1835-га памёр ад сухотаў і сам Юзаф. Яго аддалі зямлі на мясцовых могілках (звяртаемся да бярэзінскіх краязнаўцаў з просьбай дапамагчы ў пошуку пахаванняў сям'і Шэмешаў).** Прыкладна тады ж брат Юзафа Адам прадае маёнтак. Ці то сумныя ўспаміны, ці то фінансавыя варункі сястры, якая страціла дом праз пажар 1835 года ў Мінску, а можа, і тое, і другое разам прымусілі мастака расстацца са спадчынай бацькі.

Творы, якія пакінуў Юзаф, у асноўным пісаліся з 1830 па 1832 гады. Гэта была самая важная ў жыцці кожнага юнака пара — час першага кахання. Нешчаслівага, як ва ўсіх паэтаў. Пад уплывам пачуццяў малады чалавек сярод іншага напісаў драму "Фатальны пацалунак", што, на думку аўтара некралога, была самым арыгінальным і дасканалым вершаваным эпізодам Юзафа. Сам хлопец чытаў няшмат, у асноўным творы, якія набылі славу (і якія не заўсёды апраўдвалі чаканні, бо ён меў аналітычны склад розуму, любіў разбірацца ў дробязях). На вялікі жаль, спярша цяжкія хваробы, потым маёмасны клопат, а за імі і "смерць на ўздыме", не дала паэтычнаму таленту Юзафа разгарэцца на поўную моц.

Усё, што мы маем сёння, гэта надрукаваныя ў 1838 годзе вершы. Магчыма, недзе ў архівах Шэмешаў або іх сваякоў захоўваюцца невядомыя цяперашняй публіцы творы, у тым ліку і "Фатальны пацалунак". Паважаныя чытачы, калі ласка, далучайцеся да пошукаў!

Пасля 1838-га імя Юзафа Шэмеша толькі адзін раз з'явілася на старонках газет: 23 лістапада 1993 года "Кур'ер віленскі" надрукаваў зусім маленькі артыкул — вытрымку з публікацыі 1838-га. А на радзіме яго імя зусім не было вядомае.

А значыць... З вяртаннем!

Зміцер ЮРКЕВІЧ



Метрыка хросту Адама Шэмеша

Аляксандра Манюшка з сынам. Мастак — Адам Шэмеш

Віленскія бернардзінскія могілкі, месца апошняга спачыну Адама Шэмеша і яго маці

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7.
Тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627
Пошта: kupalabilet@mail.ru

- Камедыя ў 2 дзеях **"Паўлінка"**. Галоўная сцэна. **26 лістапада а 19.00, 2 снежня а 19.00.**
- Рэквіем у 1 дзеі **"Вечар"**. Галоўная сцэна. **27 лістапада а 19.00.**
- Трагіфарс **"Donna sola (Жанчына адна)"**. Прэм'ера. Камерная сцэна. **29 лістапада а 19.00.**
- Прадстаўленне **"Музыка жыцця"**. Прэм'ера. Камінная зала. **29 лістапада а 19.00.**
- Пластычны спектакль у 1 дзеі **"Наш космас"**. Прэм'ера. Галоўная сцэна. **30 лістапада а 19.00.**
- Трагікамедыя **"Чакана гучна і да болю блізка"**. Прэм'ера. Камерная сцэна. **1 снежня а 19.00.**
- Звычайная гісторыя **"Час жыцця"**. Прэм'ера. Галоўная сцэна. **3 снежня а 19.00.**
- Надзвычайна неверагоднае здарэнне ў 2 дзеях **"Жаніцьба"**. Галоўная сцэна. **4 снежня а 19.00.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 8 017 3970163
(экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выстава **"А. Я. Архіпаў і майстры Саюза рускіх мастакоў"**, прымеркаваная да 160-годдзя з дня нараджэння выдатнага жывапісца А. Я. Архіпава і 120-годдзя з даты заснавання Саюза рускіх мастакоў. **Да 22 студзеня 2023 года.**
- Выстава жывапісу Мікалая Бандарчука **"Дыялог з часам"**, прымеркаваная да 70-годдзя з дня нараджэння аўтара. **Да 19 снежня.** Пераходная галерэя прыбудовы да галоўнага корпуса.
- **Выстава да 135-годдзя з дня нараджэння Марка Шагала. Да 12 снежня.**
- Выстава **"Альгерд Малішэўскі. Рэтраспекцыя". Да 11 снежня.**
- Выставачны праект **"Жаночы род". Да 1 снежня.**
- Выстава **"Шкатулка каштоўнасцей"** (традыцыйныя ўпрыгожванні народаў Еўразіі XVIII–XX стагоддзяў) з калекцыі Расійскага этнаграфічнага музея (г. Санкт-Пецярбург). У экспазіцыі прадстаўлена каля 250 шэдэўраў, якія характарызуюць ювелірную традыцыю і густы амаль 40 народаў Расійскай імперыі. **Да 11 снежня.**
- Экскурсіі: **"Якога колеру зіма?", "Казкі Усходу", "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма"**. Праводзяцца заўсёды.

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спартакомплекс "Раўбічы", Мінскі раён.
Тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя**.
- Праграма **"Каляды ў музеі". Праводзіцца заўсёды. Зборная праграма 24 снежня.** Працягласць – 2–2,5 гадзіны. Папярэдні запіс абавязковы.

УНП 100377771

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: 8 01596 36290, 8 01596 36270

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Квэст **"Белы слон"**. Разлічаны на адначасовы ўдзел ад 15 да 50 чалавек, размеркаваных па камандах (1–5 асоб). **26 лістапада.**
- Выстава **"Белая зброя краін свету"**. 1-ы адсек Паўночнага корпуса. **Да 25 снежня.**
- Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
- Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
- Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
- Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка"**.
- Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце", "Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.", "Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.", "Печы з каробкавай кафлі XVI–XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў"**.

30 лістапада 2022 г. у гасцей музея будзе права льготнага наведвання экспазіцый, створаных на аснове ўласных фондаў установы. Кошт білета для дарослых – 6 бел. руб., для школьнікаў і студэнтаў – 4 бел. руб.

УНП 590201541

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660, +375 29 5518051, +375 29 1903149

Палацавы ансамбль

- Прэм'ера канцэртнай праграмы **"Музычнае падарожжа ў мінулае". 26 лістапада а 17.00.** Тэатральная зала.
- Адкрыццё выставы работ удзельнікаў міжнароднага конкурсу па вырабе навагодняй цацкі ў тэхніцы ірландскіх карункаў **"Звяжам свет прыгажосцю". 26 лістапада а 16.00.** Белая бальная зала.
- Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"**. У складзе пастаяннай экспазіцыі.
- Часовая экспазіцыя **"GLORIA ARME: ваенна-гістарычная рэканструкцыя даспехаў і зброі"**. Вялікая выставачная зала. **Да 10 студзеня 2023 года.**
- Выставачны праект, прысвечаны Году гістарычнай памяці, **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны". Да 15 студзеня 2023 г.** У экспазіцыйнай зале першага пускавога комплексу.
- Выстава ёлачных цацак **"У Новы год прыходзіць казка..."**. Малая выставачная зала. **Да 22 студзеня 2023 г.**

Мерапрыемствы

- Квэсты: **"Палацавыя таямніцы", "Музычная скарбніца Нясвіжскага палаца"**.
- Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны", "Нясвіж – здабытак сусветнай культуры"**, выстава Паўла Татарнікава **"Магнацкія двары і замкі Беларусі"**.
- Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках г. Нясвіжа.

Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)

- Часовая экспазіцыя мастака Віктара Варанкевіча **"Погляд у мінулае". Да 30 лістапада.**

Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3)

Пастаянныя экспазіцыі

- **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII – 1-й палове XIX стст.".**
- **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі падзеі".**
- Калекцыя гадзіннікаў XIX–XX стст. **"Культура часу"**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы

- Квэсты: **"Безаблічны артэфакт", "Карта сямі каралеўстваў", "Музейны дэтэктыў", "Музейнае расследаванне"**.
- Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні", "Дзень нараджэння ў Ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
- Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"**. Да 25 чалавек.
- Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
- Гульнёвая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце niasvizh.by.

УНП 600207920

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1.
Тэл.: 8 017 2431041 (каса), 8 017 3615493

- Аперэта ў 3 дзеях **"Лятучая мыш". 26 лістапада а 18.00.**
- Балет у 2 дзеях **"Жызэль"**. Прэм'ера. **27 лістапада а 18.00.**
- Опера ў 3 дзеях **"Самсон і Даліла". 29 лістапада а 19.00.**
- Балет у 2 дзеях **"Бахчысарайскі фантан". 30 лістапада а 19.00.**
- Канцэрт **"Рака часу". 30 лістапада а 19.30.**
- Опера ў 2 дзеях **"Вясселле Фігара". 1 снежня а 19.00.**
- Балет у 2 дзеях **"Ганна Карэніна". 2 снежня а 19.00.**
- Опера-балет у 2 дзеях **"Вілісы. Фатум". 3 снежня а 18.00.**

УНП 191081322

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава мастака-ілюстратара Паўла Татарнікава **"Дакрануцца да мінулага". Да 10 студзеня 2023 года.**
- Экскурсія **"Шлях мастака Валенцін Ваньковіча"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Сядзібны партрэт"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Спектакль тэатра ценяў **"Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Белая сарока"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, д. 2.
Тэл.: 8 0212 669077 (каса)

- Казка на 1 дзею **"Кацёл з каменьчыкамі". 26 лістапада аб 11.00.**
- Музычная казка на 2 дзеі **"Церам-Церамок". 27 лістапада аб 11.00.**
- Казка-гульня на 1 дзею **"Калабок". 4 снежня аб 11.00.**

УНП 300001869

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47.
Тэл.: 8 017 4247814

- Выставачны праект **"Сусветны поп-арт: ад Уорхала да Бэнксі". Да 22 студзеня.**

УНП 192543414

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл.: 8 0222 650203, 8 0222 658800

- **Пастаянныя экспазіцыі**.
- Выстава **"Працяг сямейных традыцый. Марыя Васільеўна Ляпіна-Паленава"** з фондаў Дзяржаўнага мемарыяльнага гісторыка-мастацкага і прыроднага музея-запаведніка В. Д. Паленава. **Да 22 студзеня 2023 года.**
- Выстава **"В. К. Бялыніцкі-Біруля і мастакі з яго кола"**, прысвечаная 150-годдзю жывапісца. **Да 26 лютага 2023 года.**
- Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.** Падрабязней на сайце artmuseum.by альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл. 8 017 2030792, 8 029 1440792, 8 017 3271166

- **Пастаянная экспазіцыя**.
- Часовая экспазіцыя **"Апалены золак"**, прысвечаная 140-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Мастацкая галерэя, 3–4 паверх. **Да 28 лістапада.**
- Выстава **"Вызваленне Еўропы"** ў рамках міжнароднага праекта "Тэрыторыя Перамогі", які абъядноўвае 250 музеяў і ваенна-гістарычных цэнтраў Расіі і іншых замежных краін.
- Анлайн-выстава **"Трагедыя народаў"**.

УНП 100235472

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **8 017 3970163, +375 25 6677819.**

Культура і Мастацтва

У нашым пазнавальна-адукацыйным Telegram-канале вы можаце даведацца больш цікавых фактаў пра беларускую культуру і мову, паўдзельнічаць у штодзённых апытаннях і прачытаць пра культурнае жыццё краіны. Далучайцеся!

З пытаннямі размяшчэння рэкламы звяртайцеся па тэлефоне **8 017 2860797** або на электронную пошту **reklama@kultura-info.by**

Пераможца 2006 г.
Гран-пры 2010 г.
Пераможца 2022 г.

КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА.
ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)

Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — ДУЛЕВІЧ Віктар Іванавіч.

Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактар аддзела — Яўген РАГІН.

Аглядальнікі рэдакцыі: Надзея БУНЦЭВІЧ, Антон РУДАК, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Данііл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.

Літаратурны рэдактар — Мацвей ЗАЙЦАЎ.

Мастацкі рэдактар — Марына ПЯРКОЎСКАЯ.

Прыёмная: 8 017 3345741. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх.

Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефоны: 8 017 2860797, 8 017 3345723.

Тэлефон-факс: 8 017 3345741.

Рэкламны аддзел: тэл.: 8 017 2860797.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

*Матэрыял на правах рэкламы. ©"Культура", 2022.

Сайт: www.kultura-info.by
e-mail: kim@kultura-info.by

Наклад 2972.
Індэксы 63875, 638752.
Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 25.11.2022 у 18:00. Замова №2735.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.